а. Аляксандар Надсон

# СЬВЯТЫ КІРЫЛ ТУРАЎСКІ

Выдавецтва «Божым Шляхам»
Лёндан 1968

*З дазволу царкоўнай Улады.*



*Съв. Кірыл Тураўскі*
*(Ікона ў школе съв. Кірыла ў Лёндане)*

# I

## КІРЫЛ І ЯГО ВЕК

Сьвяты Кірыл, япіскап Тураўскі, быў бяз сумніву адной з найцікавейшых асобаў свайго часу. З аднаго боку з скупых вестах аб ягоным жыцьці перад намі паўстае постаць пакорнага манаха, які ў пошуках адзіноты з Богам вядзе; асцэтычне жыцьцё ў самых яго суровых хвормах. З другога боку мы бачым чалавека, які сваімі абшырнымі ведамі перавышаў далёка ўсіх сваіх сучасьнікаў ня толькі на Беларусі, але наагул у цэлым усходня-славянскім сьвеце. Сваімі надзвычайнымі прапаведніцкімі здольнацьцямі Кірыл заслужыў сабе на назоў другога Залатавуснага. Ён быў выдатным, хоць і ня вельмі арыгінальным, багасловам у часе, калі багаслоўская думка ў нашай краіне рабіла толькі першыя нясьмелыя крокі. Слава Кірыла, як духоўнага настаўніка, распаўсюдзілася сярод ягоных суродзічаў яшчэ ў часе ягонага жыцьця. Наканец, колькасьць і мастацкі ўзровень твораў Кірыла, якія дайшлі да нас, робяць яго найбольшым з усіх раньніх беларускіх пісьменьнікаў і першым ведамым беларускім паэтам.

Вялікая колькасьць рукапісаў з творамі сьв. Кірыла, якія дайшлі да нас, вымоўна сьведчыць аб ягонай папулярнасьці ня толькі сярод беларусаў, але і сярод усіх усходніх і паўднёвых славянаў,

пачынаючы ад Ноўгарада аж да Сэрбіі і Баўгарыі.[1] Нажаль гэтага самага ня можна сказаць адносна вестак з жыцьця сьвятога. Адзіны жыцьцяпіс Кірыла, які дайшоў да нас, знайходзіцца ў г. зв. «Пралёгу» і быў напісаны праўдападобна ў 14-тым стагодзьдзі.[2] Ён ёсьць вельмі кароткі, аднак нам пазваляе, пры помачы некаторых вестак з агульнай гісторыі і фактаў узятых з твораў самога Кірыла, адтварыць жыцьцё Кірыла ў ягоных агульных рысах.

Сьвяты Кірыл, паводле Пралёгу, нарадзіўся ў Тураве і быў сынам багатых бацькоў.

Тураў зьўляецца адным з найстарэйшых беларускіх гарадоў. Ён успамінаецца ў летапісе першы раз пад годам 980,[3] калі зьяўляўся галоўным

---

[1] Поўны абзор рукапісаў з творамі сьв. Кірыла Тураўскага дае Н. П. Еремин у сваім творы «Литературное наследство Кирила Туровского» (Труды Отдела Древнерусской Литературы АН СССР, т. XI, Масква-Ленінград 1955, бб. 346—367). Аб творах Кірыла ў сэрбскіх і баўгарскіх рукапісах глядзі: В. А. Адрианова-Перетц, Древнерусские литературные памятники в югославянской писменности. ТОДРЛ, т. XIX, 1963, бб. 9—10.

[2] Пралёг — кніга кароткіх жыцьцяў сьвятых на кожны дзень году. Найстарэйшы ведамы тэкст жыцьця сьв. Кірыла з Пралёгу, перадрукаваны з рукапісу XIV- пачатку XV стаг., знайходзіцца у: Н. К. Никольский, Материалы для истории древнерусской духовной письменности. (Сборник Отд. Русск. Яз. и Слов. Имп. Акад. Наук, т. 82, кн. 8, СПб. 1907, бб. 62—64).

Крыху пазьнейшы і адменны тэкст ёсьць у кнізе «Творения святого отца нашего Кирила епископа Туровского», изд. преосв. Евгения, еп. Минского и Туровского, Кіеў 1880, б. 296. (У далейшым гэты твор будзе прыводзіцца, як Творения ...).

[3] «Бо Рагвалод прышоў з-за мора і меў уладу ў Полацку, а Туры ў Тураве: ад яго-ж і пачалі называцца тураўцамі». Полное Собрание Русских Летописей, т. I, Ленінград 1926, стор. 76.

горадам беларускага племені дрыгвічоў. Ляжыць Тураў пры зьліцьці ракі Струменя з Прыпяцьцю, недалёка ад месца, дзе ў Прыпяць упадае з поўначы Случ. Некалі прайходзіў тудэю гандлёвы шлях, які ішоў з Балтыцкага Мора у Чорнае па Нёмане, Случы, Прыпяці і Дняпры. Акрамя Турава, іншымі важнымі беларускімі гарадамі на гэтым шляху былі Горадня і Слуцк.[4] У другой палове 10-га стагодьдзя Тураў быў сталіцаю незалежнага княства. У 980 г., або крыху пазьней, ён быў аднак заваяваны вялікім кіеўскім князем Уладзімірам і страціў незалежнасьць на больш чым 150 гадоў. Праз увесь гэты час залежнасьці ад Кіева Тураў быў кіраваны цераз князёўскіх намесьнікаў («пасаднікаў»), якія аднак вельмі часта самі належалі да князёўскае сям'і.

Некаторыя князі, якія жылі ў Тураве, былі спалучаныя сямейнымі сувязямі з знатнымі заходнімі і грэцкімі дамамі. Гэта напэўна мела ўплыў на культурнае жыцьцё гораду. Так напрыклад Уладзімір даў Тураў свайму трэйцяму сыну Сьвятаполку[5] (празванаму пасьля Акаянным), які ажаніўся прыблізна ў 1010 г. з дачкой польскага караля Балеслава Харобрага.[6] Разам з нявестаю

---

[4] Гл. М. Н. Тихомиров, Древнерусские города, Масква 1956, бб. 305—306.

[5] ПСРЛ, т. I, стоўб 121.

[6] *N de Baumgarten*, Genologies et Marriages Occidentaux des Rurikides Russes, Rome 1927, bb. 10-11;

*Leib E.*, Rome Kiev et Byzance, Paris 1924, bb. 155-157. Аб Сьвятаполку, ягонай жаніцьбе і ўсей далейшай палітыцы, глядзі абшырна ў: В. Д. Королюк, Западные Славяне и Киевская Русь, Масква 1964, бб. 208 — 268.

прыехаў з Польшчы лацінскі япіскап калабжэскі Райнбэрн, які — паводле некаторых аўтараў — спалучаў у сабе апостальскі агонь з цнотамі асцэты і праводзіў жыцьцё ў срогім умярцьвленьні і сталай малітве. Сьвятаполк, жадаючы праўдападобна аддзяліцца ад Кіева, пачаў рыхтаваць паўстаньне супраць свайго бацькі. Уладзімір, даведаўшыся аб гэтым, схапіў Сьвятополка і ягоную жонку і пасадзіў іх у вязьніцу. Пацярпеў пры гэтым і Райнбэрн, які таксама быў арыштаваны і памёр у вязьніцы. Сьвятополк выжыў, каб пасьля сьмерці Уладзіміра ў 1015 г. захапіць Кіеўскі пасад і быць галоўным віноўнікам сьмерці сваіх двух братоў, сьвятых Барыса і Глеба, якія былі забітыя на ягоны загад.

Другі князь, які быў у Тураве, Яраполк, ажаніўся прыблізна ў 1073 г. з Кунэгундай, дачкой нямецкага графа Отто з Орлямундэ.[7] У 1087 г. ён быў падступна забіты адным сваім слугою ў часе, калі вяртаўся з ваеннага паходу. Летапісец адзываецца аб ім вельмі цёпла, як аб добрым, справядлівым і пабожным князю, які любіў бедных і шмат нацярпеўся ў часе свайго жыцьця. Ён пакінуў пасьля сябе прынамся адну дачку, якая пасьля вышла замуж за аднаго знатнага немца, Гонт'ера з Турынгіі.

Малодшы брат Яраполка, Сьвятаполк ІІ, жыў у

---

[7] *Baumgarten,* op. cit.; Leib, op. cit., b. 164. Гэты апошні не падае імямі мужа Кунэгунды.

Тураве ад 1087 да 1093 г., пасьля чаго ён сеў на вялікакняжы пасад у Кіеве. Ягоная друга (або трэцяя) жонка, Барбара, была грэцкай княгіняй, спалучанай сямейнымі сувязямі з імпэратарскім домам Камнэнаў. Пасьля сьмерці свайго мужа ў 1113 г. Барбара пераехала жыць у Тураў. Там яна залажыла жаночы манастыр сьв. Барбары, дзе і была пахаваная пасьля сваей сьмерці ў 1124 г.[8]

У Тураве быў адзін з першых япіскапскіх пасадаў на Беларусі. Ёсьць весткі, быццам тураўскае япіскапства было заложанае ў 1005 г. і што першым япіскапам быў там нейкі Тамаш. Нажаль сяньня няма магчымасьці праўдзіць, наколькі гэтыя весткі ёсьць праўдзівыя.[9] Гісторыя тураўскага пасаду ў 12-тым стагодьдзі ёсьць далёка лепш ведамая. У жыцьці благаслаўлёнага Марціна Тураўскага,[10] пабожнага манаха і старэйшага сучасьніка нашага Кірыла, падаюцца імёны чатырох тураўскіх япіскапаў, у якіх Марцін быў кухарам.

---

[8] *Baumgarten,* op. cit.; Творения …, б. VIII (уступ).

[9] Першы раз гэтая ветска спатыкаецца ў г. зв. «Запавеце благаславёнага Уладзіміра для Тураўскай япіскопіі» ў Кіеўскім Пацерыку Язэпа Трызны (1647-1655). Там гаворыцца, што князь Уладзімір «трэцюю багамольную япіскопію установіў у Тураве ў лета 6513 (г. зн. 1005) і даў ей гарады і пагосты... і паставіў першага япіскапа Тамаша...» (паводле Е.Е.Галубінскага, «История Русской Церкви, том I, поўтом I, Масква 1901, б. 681).

Ня глядзячы на познасьць весткі, Галубінскі, а перад ім Макары (История Русской Церкви, т. I, СПб. 1858, б. 26), схіляюцца да таго, каб лічыць яе праўдзівай.

У кожным выпадку выглядае, што Тамаш, калі ён і быў, ня меў па сабе наступнікаў аж да пачатку XII-га стаг.

[10] Сказание о Туровском мнихе Мартине. Тэкст у «Творения...», б. 295.

Вось яны: Сымон, Ігнат, Якім і Георгі. Аб Якіме мы маем у Іпацieўскім летапісе дадатковыя весткі, паводле якіх ён быў япіскапам тураўскім ад 1144 да 1146 году.[11] Георгі быў праўдападобна беспасрэдным папярэд-нікам Кірыла.

Год 1157 быў годам вялікіх падзеяў для Турава. У гэтым годзе князь Юры Яраславіч (унук Сьвятаполка II), які быў ізгоем, г. зв. князем без удзелу, выгнаў Барыса, сына кіеўскага князя Юрага Даўгарукага, і абвясьціў Тураў незалежным княствам. Два разы кіеўскія князі з саюзьнікамі хадзілі з вайною супроць Турава. Відаць аднак, што жыхары гэтага гораду, якім напрыкрылася панаваньне князёўскіх намесьнікаў, добра баранілі сваю новаздабытою незалежнасьць. Ня могучы нічога зрабіць, кіеўскія князі павінны былі наканец прызнаць існаваньне Тураўскага Княства.[12]

---

[11] ПСРЛ. т. II, стаўпы 314 і 330.

Для паўнагы варта зацеміць, што летапісы гаво-раць аб высьвячэньні ў япіскапы ў 1114 г. некага Кі-рыла (ПСРЛ. т. I, ст. 290). Хоць там не ўспамінаецца пасаду, але шмат хто ўважае, што ён быў япіска-пам тураўскім.

Тацішчаў падае, што ў 1146 г. быў назначаны на Тураўскі пасад нехта Іван (В. Н. Татміцев, мстормя Россмйская, выд. АН СССР, т. II, Масква-Ленінград 1963, б. 151).

Такім чынам ліста Тураўскіх япіскапаў да сьв. Кірыла выглядае наступна: Тамаш (сумніўны, 1005-?), Кірыл I (сумніўны, 1114-?), Сымон, Ігнат, Якім (1144-1146), Іван (сумніўны, 1146), Георгі (1146- прыб. 1169) і наканец наш сьв. Кірыл (1169-1182 прыб.). Пасьля сьв. Кірыла япіскапам быў Лаўрын (1182-?).

[12] Першая вайна была ў 1158 г. Кіеўскі князь Ізяслаў і яго саюзьнікі стаялі 10 тыдняў пад Туравам, спустошылі аколіцы, але гораду ўзяць не маглі. Наканец пачаўся мор сярод коней і яны павінны былі вярнуцца дамоў з нічым, шмат хто пехатою (ПСРЛ, т. II, ст. 491-2). Другая вайна была ў 1160 г. і трывала толькі два з паловаю тыдні. Гэтым разам Тураўцы таксама ўмелі абараніць сваю незалежнасьць.(ПСРЛ, т. II, ст. 510).

У часе здабыцьця сваей незалежнасьці Тураў быў вялікім горадам. Паводле некаторых гісторыкаў, ён тады меў каля 40 цэркваў і манастыраў.[13]

Дзейнасьць сьвятога Кірыла прыпадае якраз на гэты першы пярыяд незалежнасьці ягонага роднага гораду.

У Пралёгу не гаворыцца, калі нарадзіўся Кірыл. Паколькі аднак, як будзе відаць ніжэй, ён быў япіскапам ужо ў 1169 г. і павінен быў тады мець каля 40 гадоў (бо малодшых звычайна не пастаўлялі у япіскапы), дык выглядае, што ён нарадзіўся не пазьней, чым у 1130 г., а магчыма раней.

Кірыл быў чалавекам вялікай асьветы. Ягонае веданьне Сьвятога Пісьма было настолькі выдатным, што некаторыя аўтары не вагаюцца лічыць яго найлепшым біблістам сярод усіх раньніх усходнеславянскіх пісьменьнікаў.[14] Ягоныя творы ёсьць ня толькі перасыпаныя вынятkамі з сьв. Пісьма, але часам цэлыя сказы зьяўляюцца ня чым

[13] Гл. *К. Т. Калайдович,* Памятники Российской словесности XII-го века. Масква 1821, б. XII (уступ).

Усе старыя тураўскія сьвятыні ўжо даўно ня існуюць. Вось сьпісак тых цэркваў і манастыроў, назовы якіх захаваліся да нашага часу:

Найстарэйшымі сьвятынямі былі напэўна цэрквы сьвятога Спаса і Багародзіцы, аб якіх успамінаецца ў «Запавеце благаславёнага Ўладзіміра». Акрамя гэтага ёсьць ведамымі царква і манастыр сьв.. Зьмітра, царква сьв. Пятра (збудованая Яраполкам) і царква Архістраціга Міхала (збудаваная Сьвятаполкам II). У XII-тым стаг. існаваў у Тураве япіскапскі манастыр сьв. Барыса і Глеба і манастыр сьв. Міколы. У гэтым апошнім быў манахам наш сьв. Кірыл. Да гэтай лісты трэба яшчэ дадаць жаночы манастыр сьв. Барбары (гл. вышэй).

[14] G. P. Fedotov, The Russian Religious Mind, New York 1960, b. 71.

іншым, як выражэньнямі ўзятымі з розных частак Бібліі і памастацку зьвязанымі ў адно цэлае, каб выразіць думку аўтара. Ня менш добра Кірыл быў знаёмы з творамі ўсходніх айцоў Царквы. Хоць ён ніколі не ўспамінае прозьвішчаў, аднак у ягоны творах ёсьць відавочны ўплыў такіх вялікіх царкоўных пісьменьнікаў, як сьв. Ян Залатавусны, Рыгор Багаслоў, Кірыл Александрыйскі, Эпіфані Кіпрскі, Прокл Александрыйскі і інш. Безумоўна, усю гэтую веду Кірыл мог здабыць, будучы ўжо ў манастыры. Яму нават ня трэба было ведаць грэцкай мовы, бо ў тым часе вялікая колькасьць твораў вышэй упомненых айцоў існавала ўжо ў славянскім перакладзе, прыйшоўшы да нас з Баўгарыі. З другой стараны знаёмства Кірыла з такімі пазьнейшымі бізантыйскімі царкоўнымі пісьменьнікамі, як Тэафікляк Баўгарскі і Мэтафраст, творы якіх былі даступныя толькі ў грэцкім арыгінале, сьведчыць аб тым, што наш сьвяты ведаў добра грэцкаю мову. Акрамя грэцкай мовы, Кірыл ведаў рыторыку і ў дасканаласьці вывучыў і апанаваў мастацкія прыёмы бізантыйскіх пісьменьнікаў таго часу. Усё гэта прымушае думаць, што будучы яшчэ юнаком, ён атрымаў добрую асьвету пад кіраўніцтвам дасьведчанага настаўніка, праўдападобна грэка. Магчыма на раньні пачатак навукі хацеў паказаць аўтар Пралёгу, гаворачы, што яшчэ да паступленьня ў манастыр Кірыл «ня ўзлюбіў багацьця і пераходнай славы гэтага сьвету, але больш за ўсё ён прылажыўся да вывучэньня Боскіх кнігаў і дабра пазнаў Боскія

пісаньні».

Дванаццатае стагодзьдзе было векам культурнага росквіту нашай краіны і Кірыл ня быў адзінай адукаванай асобай на Беларусі, хоць ён і перавышаў сваіх сучасьнікаў ведамі і здольнасьцямі. Хопіць успомніць, што сучасьнікамі Кірыла былі сьв. Еўфрасіньня Полацкая і Клімэнт Смаляціч, а сьв. Аўрам Смаленскі жыў толькі крыху пазьней. Ёсьць таксама весткі, што ў другой палове 12-га стаг. ў Смаленску існавалі школы, заложаныя князем Раманам Расьціслававічам.[15] Падобныя школы напэўна існавалі і ў іншых мясцовасьцях, асабліва пры манастырах і япіскапскіх пасадах, хоць вестак аб іх не захавалася. Акрамя школаў, ведамыя ёсьць таксама прыклады і прыватнай асьветы.[16]

Беларусь у 11-тым і 12-тым стаг. была цесна зьвязаная з Бізанцыяй, бо увайходзіла ў склад Кіеўскай Мітраполіі, якая залежала ад Канстантынопальскага Патрыярха. Амаль усе мітрапаліты і большасьць япіскапаў былі грэкамі. Бізанцыя ў тым часе перажывала культурнае адраджэньне пасьля іканаборскіх прасьледаў у палове 11-12 стаг. Ажывіўся зноў стары канстантынопальскі унівэрсытэт пад кіраўніцтвам аднаго з найбольш цікавых вучоных сярэднявякоўя,

[15] *Татищев,* ор. сіт., т. III, б. 129.

[16] Больш аб асьвеце ў XII-тым стаг. гл. Артыкул *Н. С. Чаева,* «Просвещение», у книзе «история культуры древней Руси», пад рэд. Н. Н. Вароніна і М. І. Каргера, т. II, Масква-Ленінград 1951, 66. 216-244.

Міхася Псэльляса. На чале школы права стаяў ня менш ведамы вучоны Ксыфілінос. Навучаньне на унівэрсытэце было дармовым і студэнты, якія пасьпяхова закончылі навуку, мелі запэўненыя высокія становішчы ў дзяржаўнай адміністрацыі ці ў судаўніцтве. Сярод бізантыйскіх багасловаў таго часу трэба ўспомніць Эўтыма Зігабена, аўтара «Зброі Праваслаўнага» і Тэафілякта Баўгарскага, ведамага перадусім з сваіх паясьненьняў да сьв. Пісаньня. У пачатку 12-га стаг. жылі таксама такія выдатныя пісьменьнікі, і гісторыкі, як Анна Комнэна, Нікіта Акомінатос, Ян Зонарас і шмат іншых. Грэцкіх настаўнікаў можна было спаткаць у ўсім цывілізаваным сьвеце. На захадзе іх прыймалі і слухалі з пашанаю. Было іх нямала напэўна і на Беларусі, куды яны прыяжджалі разам з мітрапалітамі і япіскапамі.

Такім чынам няма нічога дзіўнага, што Кірыл меў нагоду здабыць добрую асьвету. Вельмі магчыма, што яму нават ня трэба было шукаць яе нідзе паза родным горадам. Тураў у тым часе быў паважным культурным цэнтрам: там быў япіскапскі пасад і шмат манастыроў. Ды і ня так даўно там жыла грэцкая княгіня Барбара, і ў яе акружэньні былі вучоныя асобы, якія маглі пакіраваць асьветаю здольнага юнака.

Будучы сынам багатых бацькоў, Кірыл аднак «ня ўзлюбіў багацьця і пераходнай славы гэтага сьвету». Яшчэ ў маладым веку ён пастанавіў пасьвяціць сваё жыцыцё Богу і ўступіў у Манастыр. Хоць жыцьцяпісец ня ўспамінае назову гэтага

манастыра, але ў адным з пазьнейшых рукапісаў гаворыцца аб Кірыле, як аб манаху манастыра сьв. Міколы ў Тураве.[17]

У манастыры Кірыл «стараўся больш за ўсіх дагадзіць Богу і, падпарадкаваўшы сабе цела пастом і малітвамі, зрабіў з сябе дастойнае жыльлё Сьвятога Духа». Сваім спосабам жыцьця, пабожнасьцю і, без сумніву ,вучонасьцю, ён хутка зьвярнуў на сябе ўвагу іншых, і да яго пачалі прыходзіць, каб паслухаць рады ці павучэньня. Хоць сам ён меў нахіл да жыцьця ў адзіноце, Кірыл аднак ніколі не адмаўляўся памагчы іншым, маючы моцную сьведамасьць грамадзкага характару хрысьціянства. Цікава, што хоць Кірыл сам вёў вельмі срогі спосаб жыцьця, аднак у сваіх павучэньнях ён рабіў націск не на вонкавыя хвормы асцэтызму, але на нутраныя цноты пакоры і паслушэнства. Вось што кажа аб гэтым жыцьцяпісец: «(Кірыл) прынёс карысьць для многіх сваей навукаю, заахвочваючы манахаў да пакоры і каб былі паслушнымі ігумену, быццам Богу, бо манах, які ня слухае ігумена, якому ён прырок (паслушэнства), ня можа быць збаўленым».

Асабістыя схільнасьці цягнулі аднак Кірыла да большай адзіноты і таму, пасьля некаторага часу супольнага жыцьця ў манастыры, ён, «жадаючы яшчэ большых подзьвігаў, увайшоў у стоўп і там

[17] «Малітвы уміленьня недастойнага і больш за ўсіх грэшнага манаха Кірыла ў сывятога Міколы ў Тураве...». Гл. «Творения ...», б. LXXX (уступ).

зачыніўся». Стоўпніцтва зьяўляецца адной з найбольш суровых хвормаў асцэтычнага жыцьця. Яго практыкавалі ў пятым стагодзьдзі некаторыя манахі на Блізкім Усходзе і ў Бізантыі. У пошуках большай адзіноты, яны будавалі свае кельлі на плятформе, якая на адным або больш стаўпах узвышалася над зямлёю. Таму яны і называліся стоўпнікамі, або па грэцку стылітамі (ад грэцкага слова стылёс — стоўп). Самымі ведамымі з гэтых асцэтаў былі сьв. Сымон Стоўпнік (390 - 459) і ягоны вучань сьв. Даніла Стоўпнік (409 - 493). Кліматычныя ўмовы Беларусі не пазволілі б ніводнаму чалавеку весьці падобны спосаб жыцьця. Дзеля гэтага «стоўп» нашага Кірыла быў напэўна не стаўпом, але стаўпападобнай кельляй, або маленькай вежай (па грэцку пыргос), дзе ён зачыніўся.

Пярыяд стоўпніцтва быў для Кірыла часам яшчэ больш інтэнсыўнага духовага жыцьця і ня менш інтэнсыўнай умысловай дзейнасьці. Аўтар Пралёгу кажа, што ў стаўпе Кірыл «яшчэ больш трудзіўся пастом і малітвамі, і паясьняў шматлікія сьвятыя пісаньні». Вельмі магчыма, што ў гэтым часе Кірыл напісаў свае малітвы і каноны, а таксама некаторыя творы аб духовым жыцьці.

Як вельмі часта здараецца ў падобных выпадках, пошукі адзіноты мелі зусім адваротны вынік. Кірыл стаўся настолькі ведамым, што калі памёр Тураўскі япіскап Георгі, дык князь і ўвесь народ прасілі аднагалосна Мітрапаліта назначыць яго на Тураўскі

пасад.[18]

Як япіскап, Кірыл, паводле словаў жыцьцяпісца, «працаваў шмат для Царквы Божае». Інтэнсыўная пастырская дзейнасьць не перашкаджала яму браць удзел таксама і ў справах, якія датычылі ўсей Кіеўскай Мітраполіі, да якой належала і Тураўская епархія. У 60-тых гадох дванаццатага стагодзьдзя ў гэтай мітраполіі паўстаў закалот з прычыны некага Тодара, або Тодарца, які подступам атрымаў беспасрэдна ад Канстантынопальскага Патрыярха назначэньне на Растоўскі пасад, абмінаючы пры гэтым Кіеўскага Мітрапаліта, які быў ягоным беспасрэдным зьверхнікам. У сваіх паступках Тодар меў магутнага апякуна ў асобе ўладзімірскага князя Андрэя Багалюбскага. Гэты князь, які аставіў па сабе нядобры ўспамін, хацеў дзеля палітычных мэтаў мець у сваім княстве асобную царкоўную правінцыю, магчыма нават мітраполію, незалежную ад Кіева. Мітрапаліт Кіеўскі ня прызнаў назначэньня Тодарца на Растоўскі пасад, адлучыў яго і забараніў усім сьвятаром і верным мець нешта супольнае з ім. У адказ на гэта Тодарац, пэўны у князёўскай апецы, пачаў прасьледаваць сваіх праціўнікаў і адначасова прапаведваць пэўную неазначаную бліжэй гэрэзію. Яму аднак прышлося горка дасьведчыць, як няпэўным ёсьць лёс тых, якія надзеюцца на ласку сьвецкіх валадароў. Андрэй

[18] Тураўскім князем быў тады праўдападобна ўжо Сьвятаполк (1167-90) сын Юрыя Яраславіча, які здабыў незалежнасьць для гораду. Кіеўскім мітрапалітам быў грэк Кастусь II (1167-?).

зьмяніў сваю палітыку і пачаў шукаць пагадненьня з Мітрапалітам. Ён арыштаваў Тодарца і адправіў яго ў Кіеў на мітрапалічы суд.

Там ён быў асуджаны і памёр лютай сьмерцю.[19] Гэта здарылася ў траўні 1169 году.

Кірыл, які меў вельмі высокае паняцьце япіскапскай годнасьці, не астаўся збоку ад гэтай сумнай справы. Вось што піша аб гэтым жыцьцяпісец: «Адносна-ж Тодарца, так пагардліва празванага, дык благаслаўлёны Кірыл раскрыў ягоную ерась пры помачы Боскіх пісаньняў і пракляў яго». Да нас дайшоў адзін твор сьвятога Кірыла супраць Тодарца. Ён назьваецца «Прыповесьць аб кульгавым і аб сьляпым». Кірыл бароніць у ім годнасьць япіскапскага стану супроць тых, якія недастойна яго жадаюць. Акрамя гэтага ў Пралёгу ўспамінаецца, што Кірыл напісаў шмат лістоў да Андрэя Багалюбскага. Гэтыя лісты да гэтага часу ня знойдзеныя. Вельмі магчыма, што ў іх сьвяты дакарае князя за ягоныя недастойныя паступкі ў справе Тодарца і за разьбіваньне царкоўнай еднасьці.[20]

---

19 На загад Мітрапаліта Кастуся, яго завезьлі на «Песі востраў» на Дняпры, адрэзалі правую руку і язык і выкалалі вочы (ПСРЛ., т. І, ст. 356; т. ІІ, ст. 552-3). Праўда, летапісец кажа, што раней Тодарац абыходзіўся ня менш налюдзка з сваімі праціўнікамі (гл. ПСРЛ, т. І, ст. 356). Усё гэтае здарэньне зьяўляецца сумным дакумэнтам абычаяў таго часу.

20 Факт перапіскі скромнага тураўскага япіскапа з гордым князем не павінен нас дзівіць. У сваей моладасьці Андрэй бываў у Тураве, калі ён атрымаў гэты горад разам з Пінскам, Дарагабужам і Перасопніцай ад свайго бацькі Юрыя Даўгарукага ў 1151 г. Магчыма ён і сьв. Кірыл ведалі адзін другога з таго часу.

Справа Тодарца пазваляе нам між іншым устанавіць прыблізны час, калі Кірыл стаў япіскапам. З аўтарытэтнага тону «прыповесьці аб кульгавым і сьляпым» і з вышэй прыведзенай зацемкі з Пралёгу (Кірыл пракляў Тодарца), выглядае што ў часе сваіх выступленьняў супроць Тодарца ён быў ужо япіскапам. Гэтыя выступленьні былі перад арыштам гэтага апошняга, які меў месца 8-га траўня 1169 г.[21] Такім чынам сьвяты Кірыл быў ужо япіскапам не пазьней, чым у пачатку 1169 г.

Час япіскапства Кірыла быў часам ажыўленай пісьменьніцкай дзейнасьці, якая напэўна была цесна зьвязаная з ягонымі пастырскімі абавязкамі. Жыццяпісец успамінае, што ён напісаў «павучэньні на тэмы Евангельля і прарокаў, казаньні на Гасподнія сьвяты і шмат іншых твораў карысных для душы, а таксама малітвы і пахвалы шматлікім сьвятым». Маючы на ўвеце дабро іншых, Кірыл «напісаўшы ўсе гэтыя творы, перадаў іх Царкве, якая захавала іх да сяньняшняга дня дзеля пацяшэньня і павучэньня верных усяе Русі».

Нажаль з усіх вышэй успомненых твораў, якія Кірыл напісаў будучы ўжо япіскапам (павучэньні, казаньні, пахвалы сьвятым), да нас дайшло толькі

---

[21] Летапіс падаюць розныя даты арышту Тодарца. Паводле Лаўрэнцеўскага Летапісу гэта здарылася 8-га траўня 1169 г. (ПСРЛ, т. I, ст. 355), а паводле Іпаціеўскага — 8-га траўня 1172 г. (ПСРЛ, т. II, I ст. 552). Звычайна прыймаецца першая дата.

восем казаньняў на нядзелі і сьвяты Вялікоднага пэрыяду. Магчыма і далейшыя пошукі адкрыюць іншыя загубленыя скарбы духовай і літаратурнай спадчыны нашага сьвятога.

Пралёг не дае нам больш ніякіх вестак з япіскапскай дзейнасьці Кірыла. Канчаецца ён коратка, не забыўшыся аднак успомніць у пару словах, што Кірыл аставіў пасьля сябе памяць добрага і дбайлівага пастыра: «Такім чынам, пажыўшы чэсна і пабожна, і дбайліва пасучы даручанае яму стада, ён перайшоў да жыцьця вечнага і безканечнага».

У жыцьці Кірыла няма нічога аб даце сьмерці. З летапісу аднак ведама, што на пастрыжэньні ў манахі новага ігумена Кіева-Пячэрскай Лаўры Васіля ў 1182 г. быў прысутны, сярод іншых царкоўных дастойнікаў, Тураўскі япіскап Лаўрын.[22] Такім чынам трэба прыпушчаць, што ў гэтым годзе Кірыла ня было ўжо ў жывых. Думка некоторых вучоных, быццам Кірыл адрокся Тураўскага пасаду і пайшоў зноў у манастыр, ня мае дастатковых даных.

Найстарэйшы ведамы сьпісак жыцьця сьв. Кірыла паходзіць з канца 14-га або з пачатку 15-га стаг. Такім чынам ягонае напісаньне трэба аднесьці да 14-га або нават, паводле думкі некаторых

[22] ПСРЛ, т. II, стоўп 627.

гісторыкаў, да канца 13-га стагодзьдзя.[23] У тым часе культ сьвятога Кірыла быў распаўсюджаным сярод усіх усходніх славянаў. Бязумоўна ў самым Тураве яго лічылі сьвятым далёка раней, магчыма адразу пасьля ягонай сьмерці. Вось прыгожая малітва, якою канчаецца жыцьцё нашага сьвятога ў Пралёгу:

«Радуйся, слаўны сьвяціцелю, настаўнік, другі Залатавусны, які зазьзяў больш за ўсіх на Русі. Радуйся ты, што сваім сьветлым вучэньнем усе куткі Русі прасьвяціў. Радуйся ты, што, як сонца, прынёс сьвятло Боскай навукі для тых, што сядзелі ў цемры. Мы ўзносім да цябе ў малітве гэтую пакорную просьбу: маліся за нас Усявышняму, у чыёй прысутнасьці ты асьмельваешся знайходзіцца, каб Ён выбавіў нас ад цяперашніх напасьцяў і вызваліў ад бязбожных агаранаў,[24] якія мучаць нас бязустанку. Зрабі таксама, каб мы тваімі малітвамі маглі атрымаць міласьць і адпушчэньне грахоў і насьледзтва вечных добраў у будучым жыцьці ў Хрысьце Ісусе Госпадзе Нашым».

Памяць сьвятота Кірыла сьвяткуецца 28-га красавіка.

---

[23] Гл. Е. *Е. Голубинский,* История канонизации святых Русской Церкви. (Чтения в Обществе истории и Древностей Российских, Москва 1903, кн. I, б. 140).

[24] Г. зн. татараў.

## II

## ДУХОЎНЫ НАСТАЎНІК

У жыцьці сьвятога Кірыла гаворыцца, што будучы яшчэ ў манастыры, ён быў карысным для многіх сваімі павучэньнямі. Аб характары гэтых павучэньняў даюць добрае паняцьце ягоныя асцэтычныя творы. Сяньня ведамыя два такія творы, абодва аб законным жыцьці.[25] Першы з іх называецца «Прыповесьць аб бесклапотным цару».[26] З зьместу відаць, што гэта быў адзін з раньніх твораў Кірыла. У ім адчуваецца пэвен «юнацкі» энтузіязм і таксама аднастароннасьць, не зраўнаважаная яшчэ доўгагадовым дасьведчаньнем. Чытаючы «Прыповесьць», часам маецца ўражаньне, што для аўтара манастырскае жыцьцё было адзіным хрысьціянскім. Кірыл нават ужывае да манахаў словы Хрыста: «Ойча сьвяты… не за ўвесь сьвет малю, але за тых, якіх Ты мне даў» (гл. Ян 17, 9). Вось пачатак «Прыповесьці»:

---

[25] Тут разглядаюцца толькі творы, якія без сумніву належаць сьв. Кірылу. Адносна аўтэнтычнасьці ягоных асцэтычных твораў глядзі: L. Goetz, Die Echtheit der Monchreden des Kirill von Turov, Archiv fur Slavische Philologie, Band 27, Berlin 1905, bb. 181—198; такасама Еремин op. cit., бб. 344—349.

[26] Гэты твор называецца таксама «Пісьмо шмат-грэшнага мніха Кірыла да Васіля ігумена Пячэрска-га аб сьвецкім чалавеку і аб манашастве і аб душы і аб пакаяньні». Імя ігумена Васіля было аднак пэўна устаноўленае пазьнейшымі перапісчыкамі. Гл. Соеіг ор. сіг., бб. 190—191; таксама Еремин ор. сіс., бб. 344—345.

«У адным горадзе быў вельмі ласкавы цар, добры і літасьцівы, які дбайліва клапаціўся аб сваіх людзях. У адным ён толькі пастпаў неразумна: не баючыся ніякіх закалотаў, ён ня меў падрыхтаванай збройнай сілы. Ён ня думаў, каб хто-небудь захацеў паўстаць супраць яго. Меў гэты цар шмат прыяцеляў і радных і дачку на выданьні. Сярод гэтых радных быў адзін мудры і чэсны, які вельмі сумаваў з прычыны бесклапотнасьці цара і шукаў добрай нагоды, каб пагутарыць з ім аб патрэбе быць падрыхтаваным да вайны. Адзін раз раптам паўстаў сярод ночы вялікі закалот у горадзе. Цар сказаў сваім радным: хадзем, паходзім па горадзе і магчыма знойдзем таго, хто ўзьняў бунт, бо я цяпер у вялікім страху. Яны вышлі і абыйшлі кругом, але нічога не знайшлі акрамя вялікага забурэньня ў цэлым горадзе. Калі ўсе радныя стаялі прыгнобленыя і бездапаможныя, той добры радны ўзяў цара і ягоную дачку і прывёў іх да вялікай гары, дзе было шмат рознай зброі. Яны заўважылі там сьвятлю, якое зьзяла цераз маленькае акенца з пячоры. Прыпаўшы да гэтага акенца, яны ўбачылі ўнутры жыльлё, а ў ім мужчыну, які жыў у апошняй беднасьці і быў апрануты ў грубое рызьзё. Пры ім сядзела ягоная жонка і сьпявала яму салодкую песьню. Перад ім стаяў на цьвёрдым камяні нехта высокі і прыгожы і даваў яму есьці і чэрпаў віно. Калі-ж той мужчына прыймаў чашу, дык яго каранавалі пахваламі з вялікай радасьцю. Убачыўшы ўсё гэта, цар прызваў сваіх прыяцеляў і сказаў: «Гляньце, сябры, на цуд, як гэтае беднае і

скрытае жыцьцё мае ў сабе больш радасьці, чым наш магутны стан, а нутраныя (цноты) ярчэй за вонкавыя зьзяюць».

Наступна ідзе паясьненьне прыповесьці: «Горад ... гэта людзкое цела... Цар ёсьць розум, які кіруе целам... Вялікі ў горадзе закалот азначае нечаканае няшчасьце: хваробу, ці патоп, ці калецтва, ці якую крыўду ад сьвецкіх уладаў... Гара ёсьць манастыр, а ў ім — духовая зброя: пост, малітва, сьлёзы (жалю за грахі), устрымлівасьць, чысьціня, любоў, пакора, працавітасьць, цярплівасьць... Мужчына, які жыве ў апошняй беднасьці — гэта ўвесь манашскі стан... Жонка, што сядзіць пры ім і сьпявае салодкую песьню, ёсьць неадлучная памяць сьмерці... А прыгожы мужчына, што стаіць перад ім, ёсьць сам Хрыстос... Ён корміць і чэрпае віно, гэта значыць дае ўсім верным Сваё Чыстае Цела дзеля астаўленьня грахоў і Сьвятую Кроў дзеля жыцьця вечнага».

Твор канчаецца пахвалаю законнага жыцьця.

«Прыповесьць аб бясклаттотным цару» ёсьць добрым прыкладам алегарычнага мэтаду, ужыванага вельмі часта сьв. Кірылам. Узорам самой прыповесьці напэўна паслужыла падобная прыповесьць аб цару і добрым радным у ведамай гісторыі аб Барлааме і Ёасафе. Гэтая гісторыя, аўтарам якой лічыцца сьв. Ян Дамаскін, цешылася ў сваім часе вялікай папулярнасьцю як на ўсходзе так і на захадзе і была ведамай сярод усходніх славянаў ужо ў канцы 11-га або найпазьней у пачатку 12-га

стагодзьдзя.[27]

---

[27] Вось для параўнаньня скарочаны зьмест прыповесьці з гісторыі аб Барлааме і Ёасафе: «Быў цар, які разумна правіў сваей дзяржавай і ласкава абыходзіўся з людзмі. Дрэнна толькі было, што ён, няведаючы Бога, пакланяўся ідалам. Меў цар аднаго раднага, які быў добрым чалавекам, адароным праўдзівай вераю ў Бога... Гэты радны шукаў нагоды, каб зьвярнуць увагу свайго ўладара на тое, што ёсьць добрым. Адзін раз уночы цар сказаў яму: Хадзем, паходзім па горадзе, магчыма ўбачым нешта павучальнага. Ходзячы так, яны заўважылі прамень сьвятла, які выходзіў праз шчылiну. Прыпаўшы да шчыліны, яны ўбачылі пячору, а ў ей мужчыну, які жыў у беднасьці, апрануты ў рызызё... Пры ім стаяла ягоная жонка і чэрпала віно. Калі-ж мужчына прымаў чашу ў свае рукі, яна сьпявала яму салодкую песьню і цешыла яго танцамі і пахваламі... Цар сказаў свайму раднаму: «Што гэта за цуд, што наш стан, так багаты ў розныя гонары і выгоды, ніколі ня меў ў сабе столькі радасьці, сколькі мае беднае жыцьцё гэтых прасьцякоў»... Нарэшце цар спытаўся свайго раднага, хто былі гэтыя людзі, і пачуў адказ: «Усе тыя, якія аддаюць перавагу вечнаму перад часовым». (Паводле St. John Damascene, Barlaam and Joasaph, Loeb's Cglassical Library, London 1953, bb. 229—232).

Першы, хто зьвярнуў увагу на падабенства між прыповесьцямі ў гісторыі аб Варлааме і Ёасафе і ў сьв. Кірыла, быў М. М. Сухомлинов у 1858 г. (гл. 2-ое выд. ягонага твору «О литературных сочинениях Кирилла Туровского», Сборник ОРЯС Имп. АН, т. 88, Пецярбург СПб. 1908, бб. 327—330.

Перайманьне тэмаў з твораў іншых пісьменьнікаў было звычайным зьявішчам у старажытных часах. У сьв. Кірыла аднак гэтае перайманьне было творчым і ён зьмяніў тэкст у адпаведнасьці да сваіх патрэбаў. Наагул трэба быць асьцярожным у пытаньнях літаратурнага перайманьня, асабліва калі маецца справу з творамі тыпу «Гісторыі аб Варлааме і Ёасафе», пачаткі якой трэба шукаць у старой індыйскай легендзе аб жыцьці Будды. Перад тым, чым яна атрымала сваю канчатковую хрысьціянскую хворму, гэтая гісторыя перацярпела шмат зьменаў і часткі яе ўвайшлі ў склад народнай творчасьці розных усходніх народаў. Магчыма тады, што сьв. Кірыл знайшоў узор да сваей прыповесьці ў народным пераказе, а не ў пісьмовым творы. Гэта ёсьць між іншым думка ўкраінскага паэта і вучонага І. Франко, які ўважае, што Кірыл ўзяў тэму да свае прыповесьці з жыдоўскіх крыніцаў, з якімі ён пазнаёміўся не ў пісьмовай хворме, але ў вусным пераказе (гл. ягоны артыкул «Притча про сліпця і хромця», Статьи по Славяноведению под ред. В. М. Ламанского, Вып. II, СПб. 1906, бб. 137—139).

Пры нагодзе варта зазначыць, што «Гісторыя аб Барлааме і Ёасафе» была шырока ведамай на Беларусі. Яна была надрукаваная пабеларуску ў Кутэінскім манастыры ў Оршы ў 1637 г. Часткі «Гісторыі» ўвайшлі ў беларускую народную творчасьць, як духоўныя песьні «Аб старцу Арлаване і Алісахвею», або «Аб царэвічу Алісахвею». Тры песьні аб Алісахвею надрукаваў Е. Раманаў у сваім «Беларускім Зборніку». (Вып. 5. Віцебск 1891, 66. 371—377).

Другі твор сьв. Кірыла аб законным жыцьці завецца «Сказ аб манашаскім стане ад Старога і Новага Запаветаў, паколькі манах носіць у сабе вобраз першага і робіць учынкі другога». Хоць некаторыя алегарычныя (іншасказальныя) вобразы ў «Сказе ёсьць досыць цяжкімі для зразуменьня, аднак увесь твор мае ў сабе адзнакі сыталай і зраўнаважанай думкі. Дзеля гэтага ад яго трэба пачынаць разгляд асцэтычнай навукі сьв. Кірыла.

Перадусім, паводле гэтага твору, манах прыносіць сябе ў ахвяру Богу, падобна старазаконнаму ягняці, і таму ён павінен быць чыстым і без заганы: «Згодна з вобразам Старога Запавету, ты прынёс сябе ў ахвяру Богу, падобна як ягняты, якія некалі былі забіваныя ў пустыні. Дык ня будзь каросьлівы, ні кульгавы, ні сьляпы, ні паранены, бо ўсе такія, дзеля сваіх заганаў, аддаюцца на страву сабакам і птушкам». Бязумоўна, усе гэтыя вады ёсьць духовыя: кароста — гэта грахі, кульгавасьць — прывязанасьць да рэчаў гэтага сьвету, сьлепата — бескарыснае, самалюбнае жыцьцё.

Ахвяра, будучы дабравольнай, павінна быць поўнай: «Паводле Старога Запавету кожная вольная ахвяра, вялікая ці малая, павінна прыносіцца Богу ад шчырага сэрца. Хай ня будзе хвальшывых ваганьняў у тваіх думках. Ты як сьвечка: маеш сваю волю толькі да царкоўных дзьвярэй, а пасьля не глядзі, што і як з табою зробяць. Ты як вопратка: ведай сябе, пакуль нехта ня возьме цябе ў рукі, а пасьля ня думай нічога нават, калі цябе падзяруць на анучы.

Таксама і ты, мей сваю волю да паступленьня ў манастыр, а пасьля пастрыжэньня не захавай ў сваім сэрцы ніякай самаволі, каб не памерці душою, як Ананьня, калі ён пачуў Пятра, які казаў яму: «Нашто захацеў ты спакусіць Духа Сьвятога? Ты салгаў не людзям, а Богу» (гл. Ап. Дз. 5, 3-4). Ня будзь абыякавым да тваіх абяцаньняў, каб на тебе ня збыліся словы Пісаньня: «Лепш было не пазнаць праўды, чым, пазнаўшы, адвярнуцца ад яе» (гл. 2 Пятр. 2, 21).

Матыў мае аснаўное значэньне ува ўсіх людзкіх учынках: «Бог сказаў Майсею: «Вывядзі з Ягіпту мой народ Ізраіля, каб, ішоўшы, насьледавалі землю, якую я абяцаў Аўрааму. Людзі, пачуўшы гэта ад Аарона, пасьпяшылі, ў дарогу: адны ў радасьці Божага абяцаньня; другія таму, што не маглі пераносіць цяжкой работы фараонавай; іншыя, боня былі ў сілах рабіць цэглы і будаваць горад; іншыя яшчэ, ня могучы больш цярпець зьдзеку прыганятых».

У падобны спосаб кожны, хто жадае паступіць у манастыр, павінен добра здаваць справу з таго, што яго змусіла выбраць гэты спосаб жыцьця: «Ты-ж, браце, калі хочаш сьледаваць за Хрыстом, які вядзе цябе да неба, мей на ўвеце, чаму ты ўцякаеш з разумнага Ягіпту,[28] якім ёсьць гэты сьвет: ці ты

[28] Выхад жыдоў з Ягіпту, як вобраз паступленьня ў манастыр (г. зн. выхад з гэтага сьвету), ёсьць ведамым у ўсходняй духовай літаратуры. Вось прыклад з «Лесьцвіцы» святога Яна Лесьцьвеньніка (памёр у 649 г.): «Калі мы хочам выйсьці з Ягіпту і ўцячы ад фараона, мы павінны мець Майсея, — нашага пасярэдніка перад Богам, — які, стоячы паміж дзеяньнем і кантэмпляцыяй, уздымае свае рукі, каб мы, пад яго правадніцтвам, маглі перайсьці цераз мора грахоў і прагнаць Амаліка нашых дрэнных пажаданьняў». (Гл. Migne, Patr. Graeca, том 88, б. 635-636).

жадаеш абяцанага каралеўства, ці ня хочаш рабіць грэшнай работы д'ябальскай, ці можа ня любіш жыцьцёвых клопатаў, ад якіх няма карысьці, а толькі згуба для душы, ці зноў цябе непакояць жонка і дзеці».[29]

Усе гэтыя матывы для паступленьня ў манастыр ёсьць добрыя і дастатковыя, але найбольшым і найлепшым з іх усіх ёсьць самое жаданьне сьледаваць за Хрыстом: «Ты-ж, манах, раздумоўвай над прыказаньнямі і жыцьцём адзінага Хрыста, які ад нараджэньня аж да крыжа цярпеў непрыемнасьці, намовы, пагарду і раны дзеля цябе — і падрыхтуйся пераносіць цяжкасьці... Памятай, што ў пастрыжэньні тваей галавы ты носіш вобраз цярнёвага вянка Хрыстовага». Крыху далей Кірыл зноў вяртаецца да гэтай тэмы, падчырківаючы адначасова грамадзкі характар манашаскага прызваньня «Старайся стацца сынам Божым праз Хрыстовыя цярпеньні, каб ня толькі самому збавіцца, але таксама аздаравіць таго, хто папаўся сярод грахоўных разбойнікаў».

Паколькі мучанікі зьяўляюцца найбольш

---

[29] Выглядае, што ў тым часе ня лічылася нечым надзвычайным, калі нехта ўступаў у манастыр, пакінуўшы жонку і дзяцей. Сьв. Тодар Студыт (759—826) у адным з сваіх павучэньняў для манахаў кажа: «Ціж некаторыя з вас не пакінулі бацькоў, іншыя — братоў, іншыя — жонак і дзяцей, іншыя — хаты, іншыя — палі, а ўсе апошнія — і гэта ёсьць найбольш цяжкім — адракліся сваей волі?». (гл. Migne, Patr. Gr., т. 99, б. 673).

дасканалымі пасьлядоўнікамі Хрыста, дык манашаскае жыцьцё павінна быць прадаўжэньнем мучаніцтва: «Змагайся цярпліва, мужна церанось ўсялякія нявыгоды, насьледуючы мучанікаў, якія пралілі сваю кроў за Хрыста».[30]

Паколькі манах прыносіць сябе ў ахвяру Богу і зьяўляецца пасьлядоўнікам Хрыста, дык пастрыжэньне ў манахі ёсьць нечым вялікім і мае вартасьць чуць не сьвятой тайны. Вось як напамінае аб гэтым Кірыл свайму духоўнаму сыну: «Памятай, што ты чуў прытваім пастрыжэньні: Вось Хрыстос тут нябачана стаіць. Дык глядзі, каму ты даваў абяцаньні.[31] Падумай толькі: ці-ж ты ня быў тады

---

[30] Сьв. Апанас Александрыйскі (296—373) расказвае, што сьв. Антон Вялікі вельмі хацеў мучаніцкай сьмерці і дзеля гэтага нават у часе апошняга вялікага прасьледу хрысьціянаў у 311 г. ён пакінуў пустыню і прыйшоў у Александрыю. Калі аднак ягонае жаданьне ня споўнілася, «ён вярнуўся ў сваю кельлю і там кожны дзень быў мучанікам свайго сумленьня, цэлы час змагаючыся за веру». (гл. St. Athanasius, Life of St. Anthony, transl. R.T. Mayer, London 1950, б. 60). Такім чынам думка, што манашскае жыцьцё есьць прадаўжэньнем мучаніцтва, ёсьць вельмі старая. Грэцкае слова «мартыс» мае два значэньні: мучанік і сьведка. Мучанікі сваей крывёю сьведчаць аб іхняй непахіснай веры ў Хрыста. Манахі сьведчаць аб той самай веры ўсім спосабам свайго жыцьця.

[31] Вось што гаворыць сьв. Хвядос Пячэрскі (пам. 1074 г.): «Успомнім наш першы ўваход ... Ці-ж мы тады, стоячы перед сьвятымі дзьвярамі, не давалі абяцаньцяў перад відзімымі і нявідзімымі сьведка-мі, быццам у дзень суду, і нават Бога самога пры-зывалі, кажучы: ,Вось Хрыстос тут нябачана ста-іць'? Дык памятай, каму ты даваў абяцаньні! Ніхто цябе да гэтага ня змушаў». (гл. Й. А. Евсеев, Пре-подобный Феодосмй Печерскнй м его поученмя; у «Памятнмкм двернерусской церковноучмтельной лм-тературы», вып. I, СПб., 1894, 66. 36—37). Вывучаць, ці і наколькі тут быў уплыў сьв. Хвядора на сьв. Кірыла, выходзіць за рамкі гэтай працы, хоць няма сумліву, што сьв. Кірыл быў знаёмы з творамі гэ-тага вялікага ўкраінскага сьвятога. У кожным вы-падку выказваньні Кірыла і Хвядоса паказваюць, якое вялікае значэньне яны прыдавалі чыну манаш-скага пастрыжэньня.

акружаны агнём страху Божага больш чым гара Сінайская; і ці-ж ня глыбей, чым на Дошках Закону, былі вырытыя Словам Божым абяцаньні твае на цялесных дошках твайго сэрца? Уважай, каб ты не разьбіў іх тваей дрэннай вераю!»

Сьледаваць за Хрыстом ня ёсьць лёгка: чалавек без праваднікa можа заблудзіцца, як жыды, якія асталіся на нейкі час без Майсея, калі той узыйшоў на гару, каб гутарыць з Богам: «Майсей, загадаўшы ўсім прабываць у чысьціні, узыйшоў на гару, куды сам Бог зыйшоў, акружыўшы гару агнём ... І што-ж сталася ў міжчасе? Усе цуды, якія яны бачылі ,ня збавілі слабавольных людзей ад згубы: яны прыйшлі да Аарона і пачалі прымушаць яго, каб даў ім бога: а калі іхняя воля была выкананая, дык селі есьці і піць, аж пакуль агонь не загарэўся між імі і многія згінулі ад гневу Божага. І ўсе яны згінулі-б, калі-б Майсей ня стаў перад Ім у пакоры, просячы, каб Ён адвярнуў свой гнеў і ня зьнішчыў іх, пакуль ня будзе зробленая арка запавету». (Гл. Выхад разьдз. 32; таксама Пс. 105, 23-24).

Манах, каб яго не спаткаў падобны лёс, павінен знайсьці сабе духоўнага настаўніка — свайго Майсея — якому ён мусіць поўнасьцю даверыцца: «Пастарайся знайсьці мужа, які мае ў сабе Духа Хрыстовага, упрыгожанага цнотамі, да якога ўсе маюць пашану і які ўсім сваім жыцьцём любіць Господа больш за ўсё, ёсьць паслухмяны ігумену, ня мае злосьці да іншых братоў, а таксама ведае добра

сьвятыя пісаньні, пры помачы якіх ён можа накіроўваць да Бога тых, якія шукаюць неба. Такому перадай сябе, як Халеб Ісусу (Навіну), адсекшы сваю волю,[32] каб быць табе чыстай сасудзінай, якая зьберагае ўсё добрае, што ў яе ўліваецца, аж пакуль ня станешся сьвятыняй Сьвятой Тройцы, паводле сказанага: Я і Айцец мой прыдзем і жыльлё зробім у табе (гл. Ян 14, 23)».[33]

Кірыл добра ведаў усе — добрыя і заганныя — бакі манастырскага жыцьця. У ягоных творах можна часта спаткаць перасьцярогі супроць манахаў, якія «жывуць у манастыры бяз страху Божага, і думаюць толькі аб сваім жываце і аб вопратцы», а таксама «любяць сваё цела, часта мяняюць вопраткі, пад прэтэкстам сьвятаў ладзяць піры з папойкамі,

---

[32] Выражэньне «адсячэньне сваей волі» спатыкаецца у сьв. Тодара Студыта.

[33] Сьвяты Васіль Вялікі (330—379) апісвае такім чынам выбар духоўнага настаўніка: «З вялікай развагай і асьцярожнасьцю пастарайся знайсьці чалавека (манаха), які быў-бы для цябе пэўным праваднікам у гэтым спосабе жыцьця і які ўмее кіраваць тымі, што імкнуцца да Бога. Ён павінен быць асобаю ўпрыгожанай цнотамі і сваімі ўчынкамі даваць доказы любові Бога, а таксама ведаць Сьвятыя Пісаньні. Ён павінен любіць адзіноту і ня любіць багацьцяў, быць у старане ад усякіх спрэчак, ціхі, дарагі Богу, прыяцель беднасьці, спакойны, непамятлівы крыўдаў, а таксама даваць добры прыклад для ўсіх вакол яго. Ён павінен быць бяз ніякай пыхі ці гордасьці, недаступны для ліслівых пахвалаў, мець цьвёрды характар і ставіць Бога вышэй за ўсё. Калі ты знойдзеш такога чалавека, дык аддайся яму поўнасьцю, здушыўшы і выкінуўшы з сябе найменшы сьлед собскай волі, каб стацца табе чыстай сасудзінай, што зьберагае ўсё, што туды ўкладаецца, дзеля тваей большай пахвалы і славы». (гл. Migne, Patr. Graeca, т. 31, б. 631—32).

зацягваюць зборы да позьняй пары і стараюцца мець сваю волю над зьверхнікамі». Замест гэтага ён дае сваім духоўным сыном рады падобныя да вось гэтай: «Будзь слаўны ня сьветлай вопраткай, але добрымі ўчынкамі»; або «Дзерава хваляць не за рост, але за плады. Таксама не манастыр робіць слаўнымі манахаў, але добрыя цноты манахаў робяць слаўным манастыр».

Гэта апошняя прыгожая думка знаходзіцца у «Прыповесьці аб бесклапотным цару», дзе, між іншым, ёсьць шмат цікавых выказаньняў адносна практычнай стараны жыцьця ў манастыры.

Так, паводле гэтага твору, законнае жыцьцё — гэта перадусім безустанная хвала Бога. У паясьненьні прыповесьці Кірыл кажа, што зара, якая зьзяе з пячоры, ёсьць «Багахвальная ахвяра, нязмоўкнае псаломскае пяяньне алілуя; бо гаворыцца: Уночы ўздыміце рукі вашыя да сьвятых і благаславіце Госпада (гл. Пс. 133, 2); і яшчэ: Я ўстаў у поўнач, каб славіць Цябе (Пс. 118, 62)».

Жыцьцё ў манастыры ёсьць уладжанае «паводле апостальскага абычаю: ніхто ня мае сваей волі, але ўсё ёсьць агульнае.[34] Усе там ёсьць пад адным ігуменам, злучаныя з ім духоўнымі жыламі, як члены цела з галавою».

Беднасьць зьяўляецца аднэй з галоўных адзнакаў манаха: «Усякая багатая вопратка і цялесныя ўпрыгожаньні ёсьць чужымі для ігумена і

[34] Сьвяты Кірыл мае тут напэўна на ўвеце Ап. Дз. 4, 32.

для ўсяго манашаскага стану. Бо Хрыстос кажа, што тыя, якія носяць мяккія вопраткі, жывуць у царскіх харомах (гл. Мт. 1, 8). Затое манахі павінны быць апранутыя ў чысьціню, падпреразаныя праўдаю і ўпрыгожаныя пакораю».

Іншай неадлучнай спадарожніцай манаха ёсьць памяць аб сьмерці. Яна ёсьць ягонай жонкай, «якая сьпявае салодкую песьню: голас радасьці і вясельля ў жыльлях праведнікаў (гл. Пс. 117, 15). Бо праведнікі вечна жывуць і іхняя нагорода ад Госпада (гл. Мудр. Сал. 5, 16). Сьмерць праведніку — супакой (гл. там-жа 3, 3). Багацтвы праходзяць — не аддавайце сэрца вашага ім (гл. Пс. 65, 11)».

Наагул жыцьцё манаха — гэта сталы высілак і праца над сабой: «(некаторыя)... даўшы манастырскія абяцаньні, хочуць дасягнуць сьвятасьці, не стараючыся перамагчы сваіх слабасьцяў; хоць яны і чытаюць сьвятыя пісаньні, аднак думаюць, што Бог іх збавіць бяз высілку з іхняй стараны. Але мы не разумеем Паўла, які кажа: Бяз высілку ніхто ня можа атрымаць нагароды.[35] Тыя, што сьпяць, ня могуць перамагчы, а лянівыя ня могуць быць збаўленымі». Крыху далей Кірыл кажа так: «Маючы такія абяцаньні, манахі, змагайцеся... Насьледуйце высілкі сьвятых айцоў і старайцеся пераўзыйсьці адзін другога ў плачы (за грахі), у

[35] Такога сказу няма у сьв. Паўла. Кірыл тут ска-рыстаў 2 Цім. 2, 5, зьмяняючы тэкст, каб надаць жаданае значэньне.

трываньні, у малітвах, у паслугах... Уздыміце крыльлі вашага розуму і паляцім разам далёка ад згубнага граху. Возьмем страву з кнігаў сьвятых і скажам разам з Давідам: «Як салодкія паднябеньню майму словы Твае, яны для вуснаў маіх салодшыя чым мёд». (Гл. Пс. 118, 103).

Можна выдацца дзіўным, што, паставіўшы такія высокія вымаганьні для манахаў, Кірыл уважаў законнае жыцьцё лёгкім: «Забудзься аб земскіх рэчах і прымай лёгкі хлеб, як манну, з рукі кельляра і еш». Напэўна ён хацеў сказаць, што манах, даўшы абяцаньне паслушэнства, гэтым самым асвабадзіўся ад клопатаў штодзённага жыцьця.

Сьвяты Кірыл шматразова напамінаў сваім вучням аб патрэбе пакоры. З другой стараны ён уважаў, што манахам, верным свайму прызваньню, належыцца ад іншых пашана: «Нутраныя цноты сьвятых манахаў зьзяюць ясьней, чым сьвецкая слава, і дзеля гэтага магутныя гэтага сьвету схіляюць свае галовы перад імі і аддаюць ім пашану, якая належыцца тым, што дагадзілі Богу».

Вось галоўныя думкі сьв. Кірыла аб законным жыцьці. Прыблізна сто гадоў раней вялікі украінскі сьвяты, Хвядос Пячэрскі, даваў кароткія павучэньні на розныя аддзельныя тэмы для манахаў Кіева-Пячэрскай Лаўры, дзе ён быў першым ігуменам. Некалькі гэтых павучэньняў захавалася да сяньняшняга дня і яны захапляюць чытача сваей прастатой і сапраўды евангельскім духам, якім яны прасякнуты. У сьвятога Кірыла Тураўскага назіраецца нешта іншае. Тут ужо не кароткія

павучэньні на паасобныя тэмы, але спроба — першая ў усходнеславянскай рэлігійнай літаратуры — сыстэматычнага падручніка манастырскай асцэтыкі.

Асцэтычныя творы сьв. Кірыла сьведчаць вымоўна аб глыбокай духовасьці аўтара. Сяньня шмат каму ягоны падыход можа выдацца збыт срогім, асабліва ягонае вымаганьне безумоўнага паслушэнства, «адсячэньня» собскай волі. Можна таксама сказаць, што пачуцьцё страху Божага ў Кірыла часта пераважае над пачуцьцём любові. У гэтым аднак ён быў толькі пасьлядоўнікам традыцыйнай бізантыйскай духовасьці, як можна пера-канацца, параўнаўшы ягоныя творы з творамі вялікіх грэцкіх асцэтыгчных пісьменьнікаў. Асабліва шмат Кірыл заўдзячае сьв. Тодару Студыту, чые манастырскія правілы былі ў тым часе прынятыя ўсімі ўсходнеславянскімі манастырамі. Гэтыя правілы сьв. Тодар напісаў у пачатку 9-га стаг. для Студыйскага манастыра ў Канстантынопалі, дзе ён быў ігуменам. Яны адзначаліся якраз вымаганьнямі срогай, хоць разумнай, дысцыпліны і безумоўнага паслушэнства. Акрамя Тодара Студыта, сярод усходніх славянаў у канцы 11-га ці пачатку 12-га стагодзьдзяў былі ведамыя таксама асцэтычныя творы сьв. Васіля Вялікага і Яна Лесьцьвеньніка. Дык ня дзіва, што творы гэтых трох вялікіх усходніх духоўных настаўнікаў мелі, пасрэдна ці беспасрэдна, вялікі ўплыў на сьв. Кірыла Тураўскага.

Сам сьв. Кірыл ня мае прэтэнсіяў да

арыгінальнасьці, як ён прызнаецца ў канцы свайго «Сказу аб манашаскім стане»: «Гэтыя словы я напісаў не ад сябе, але з кнігаў. А калі хто інакш вытлумачыць, дык спрачацца ня будзем. Мы-ж не жняцы, але коласазьбірацелі, і ня хітрыя ў кнігах. Мы грубыя слугі і болып за ўсё патрабуем вашых айцоўскіх малітваў у Хрысьце Ісусе Госпадзе Нашым, якому хай будзе слава разам з Айцом і Сьвятым Духам цяпер і заўсёды і на векі вечныя. Амінь».

Ня гледзячы аднак на гэтыя пакорныя запярэчаньні, асцэтычныя творы сьв. Кірыла, асабліва ягоны «Сказ аб манашаскім жыцьці», маюць дастаткова арыгінальнасьці і цікавасьці, каб запэўніць іхняму аўтару пачэснае месца сярод усходніх духовых пісьменьнікаў. Яны ня страцілі сваей вартасьці да сяньняшняга дня і могуць быць карыснымі асабліва для тых, якія, паводле словаў сьвятога, «шукаюць неба».

## III

## ПЯВЕЦ БОЖАГА МІЛАСЭРДЗЯ

Духовы воблік сьвятога Кірыла нідзе ня выступае так ясна, як у ягоных малітвах, якія без сумніву зьяўляюцца ягонымі найлепшымі творамі. Сярод іх на асаблівую ўвагу заслугоўваюць штодзённыя малітвы. Усяго іх налічваецца трыццаць, па чатыры і больш на кожны дзень тыдня.[36] Першапачаткова яны былі напэўна прызначаныя для прыватнага ўжытку манахаў у перапынках між рознымі царкоўнымі службамі. Усе носяць пакутны характар. Галоўнай думкай у іх ёсьць вобраз чалавека, які стаіць у ўсей сваей грэшнай нагаце перад Тварцом і ня мае ніякай надзеі на збаўленьне, акрамя Божага міласэрдзя. Разумеючы аднак, што няўдзячныя ня могуць чуць жалю за свае грахі, Кірыл звычайна пачынае малітву ад услаўленьня Божай велічы і Ягонай бесканечнай дабраты:

«Слава Табе, Хрысьце Божа мой, за тое, што Ты ўдастоіў мяне бачыць дзень Твайго слаўнага

---

[36] Гэтыя малітвы носяць звычайна назоў «малітваў на ўвесь тыдзень». Ня гледзячы на іхні прыватны характар, Кірыл прытрымоўваецца ў малітвах літургічнага назначэньня днёў, як гэта практыкуецца у Бізантыйскім абрадзе. Такім чынам панядзелак пачынаецца малітваю да ангелаў, аўторак — да сьв. Яна Хрысьціцеля, чацьвер — да сьв. апосталаў, субота — да ўсіх сьвятых. У малітвах у сераду ўслаўляецца асабліва Найсьвяцейшая Багародзіца, а ў пятніцу ўспамінаецца мука і крыжовая сьмерць Ісуса Хрыста.

зьмёртвыхустаныня, у якім Ты вызваліў душы праведных, зьвязаных у пекле. Гэтага вызваленьня жадаю і я, Уладару мой: выбаў мяне, зьвязанага шматлікімі грахамі, і зрабі, каб у пацямнелай маей душы зазьзяла сьвятло Тваей ласкі. Я ведаю Твае нязлічоныя шчадроты і Тваю нявымоўную любоў да людзей: Ты прывёў мяне з нябыцьця да існаваньня і ўпрыгожыў падабенствам Твайго вобразу; Ты ўзвысіў мяне вышэй за іншыя зямныя істоты, даўшы мне мову і розум, і паставіў мяне ўладаром усяго стварэньня; ведаючы ўсе дні майго жыцьця, Ты апекаваўся мною ад майго дзяцінства, каб я мог быць збаўленым і стацца сябрам слаўнага чыну Тваіх ангелаў». (Нядзеля раніцай).

А вось яшчэ прыклад:

«Што Табе дам, Госпадзе Ісусе Хрысьце, Сыне Божы, за ўсё, што Ты зрабіў для людзкога роду? Якую адплату ахвярую Табе за Тваю дабрату? Ні неба, ні зямля ня могуць прынесьці Табе дастойных дароў. Ты сам захацеў прыйсьці на зямлю, каб збавіць грэшнікаў. Будучы бесцялесным, Ты прыняў цела дзеля нас і дабравольна стаўся бедным, будучы багатым». (Пятніца пасьля часоў).

Усьведаміўшы сабе такім чынам Божую дабрату, перад вачыма грэшніка з тым большай сілай паўстае веліч ягоных праступкаў і няўдзячнасьці:

«Я-ж, няшчасны, усімі маімі помысламі гнаўся за цялеснымі прыемнасьцямі і, уваліўшыся ў гной грахоў, зрабіў сябе чужым для Тваей ласкі. Будучы Тваім сынам цераз нараджэньне ў духоўнай купелі, я стаўся нявольнікам граху. Дзеля гэтага я ўздыхаю

ад глыбіні сэрца і, хворы душою, увесь занемагаю, размышляючы аб судной часіне. Як я там буду захоўвацца, што скажу аб маіх грахах і які адказ мне будзе ад Судзьдзі? Дзе я скрыю безьліч маіх праступстваў? Я ня маю нікога, хто-б дапамог і выбавіў мяне. Што мне рабіць, Госпадзе мой, Госпадзе! Ня ведаю, да каго зьвярнуцца, просячы аб збаўленьні маей душы». (Нядзеля раніцай).

Бязьмерны сум адчуваецца ў наступным прачулым лірычным апісаньні стану грэшніка:

«Я зышоў з праўдзізага шляху, які вядзе ў жыцьцё, і ўхіліўся ў пустыню асалодаў. Я ўграз у балоце маіх дрэнных учынкаў і стаўся ўвесь паранены цернямі беззаконьня. Вораг, бачачы мяне ў такім годным жалю стане, у яшчэ горшых брыдотах хоча ўтапіць маю няшчасную душу». (Серада вечарам).

Аднак няма прычыны для роспачы: Бог ёсьць літасьцівы і ня хоча сьмерці грэшніка. Ён ніколі не адкідае таго, хто прыходзіць да Яго з пакорным сэрцам. Дзеля гэтага грэшнік шукае прытулку ў Бога. Ён нават сьцьвярджае з пэўнай доляй справядлівай гордасьці, што хоць ён і саграшыў бяз ліку, аднак ніколі ня ўзьняў рук да чужога бога і ня страціў надзеі ў Божае міласэрдзе:

«Ня дай мне згінуць да канца, Ісусе — салодкае імя, — Ты, які стварыў мяне з зямлі і даў мне жыцьцё! Глянь на маю пакору: хоць я і саграшыў бяз ліку, але ніколі ня ўзьняў рук маіх да чужога бога і ня ўсумніўся, ведаючы Тваю любоў да грэшнікаў. Я размышляю аб Давідзе: ён, будучы

царом, упаў у прорву грэшных пажаданьняў і зрабіў забойства, але, пакаяўшыся перад Табою — Богам і Тварцом, — ён аказаўся дастойным Твайго міласэрдзя». (Нядзеля раніцай).

Такім чынам прыклад Давіда і іншых старазапаветных сьвятых, якія цераз пакуту атрымалі адпушчэньне грахоў, дадае надзеі грэшніку. Часамі ў Кірыла вырываецца гарачы гімн у чэсьць пакуты, якая адчыняе дзьверы Божага міласэрдзя:

«Да каго я прыбегну, просячы збаўленьня, як не да Цябе, мой Стварыцелю? Я ведаю Тваё доўгацярпеньне і Тваю сапраўдную любоў да людзей. Хто можа высказаць усе цуды зробленыя Табою адвеку і дастойна усхваліць Тваё міласэрдзе? Ты ня радуешся з сьмерці грэшніка, але цешышся з ягонага навароту да жыцьця. Дзеля гэтага ад пачатку Ты нам паказаў вобразы пакаяньня: Ты зьлітаваўся над Ізраілем, які пакаяўся, прагневаўшы Цябе ў пустыні; Ты збавіў Ніневіцянаў, асвабадзіў ад путаў Манасію, і Езакію вярнуў ад сьмерці да жыцьця. Што-ж ёсьць большым ад пакуты, так прыемнай Твайму Духу? Уся праўда людзкая ёсьць як павуціньне, што лёгка разьдзіраецца. Хто можа пахваліцца перад Табою, што ён мае праведнае сэрца, або што ён чысты ад граху? Фарысэй праведны, пахваліўшыся, быў асуджаны. Я-ж няшчасны, абняты безьлікам злых грахоў, што зраблю? У якую бездань укіну сябе? О сіла сьлёзаў, о салодкая пакута, дзеля якой Ты асьвяціў Давіда і зрабіў яго прарокам, апраўдаў мытара, грэшніцу

ачысьціў і блуднага сына, з радасьцю спаткаўшы, зрабіў удзельнікам Твайго Боскага банкету». (Пятніца раніцай).

Вялікай пацехай для грэшніка ёсьць тое, што ён не адзін, але мае шмат магутных прыяцеляў і апякуноў: ангелаў, сьвятых, апосталаў і, передусім, Найсьвяцейшую Багародзіцу. Сьвяты Кірыл асабліва ўсхваляе Яе, «у чыёй моцы ёсьць усё збаўленьне»:

«Надзея ўсіх канцоў зямлі, Найсьвяцейшая Багародзіца, ангелаў вялікае ўзьдзіўленьне, Ітрарокаў ўзвышанае прапаведаньне, апосталаў хвала, мучанікаў цьвёрдае ўмацаваньне, сьвяціцеляў выдатнае ўпрыгожаньне, князёў неперапможная дзяржава, цэркваў чэсная краса, манахаў сьвятая надзея, постнікаў непарушная моц, верных цьвёрдая абарона, лёгкае выздараўленьне хворых, добрая настаўніца для заблудзіўшых, хуткая заступніца ў бядзе, для ненавідзімых поўная любові пацеха, карміцелька сіротаў, ціхая радасьць матак, павучэньне ў мудрасьці для маленькіх, спакойная прыстань для тых, што плаваюць, лёгкі праход для: падарожных, для спрацаваных добры супакой, невычэронае багацьце бедных, пакроў і уцечка для пакрыўджаных, пацяшэньне сумных, прымірэньне з Богам для грэшнікаў, надзейная абарона ўсіх хрысьціянаў і ведамае збаўленьне для ўсяго сьвету... Усхваляю Цябе ангельскім прывітаньнем: радуйся, поўная ласкі Дзева, Маці Багародзіца, зямное неба, адухаўлёная царква, прасторны харом, селішча Бога неўмясьцімага, сьветлы ліхтар, хутчэйшая за

маланку памочніца, зорка незаходная, чаша, што мае ў сабе віно збаўленьня; купеля, што абмывае грахі; узвышэньне роду людзкога, трон хлеба жыцьця Маці Хрыста Бога нашага! Малі Яго, каб Тваім заступніцтвам, выбавіў мяне ад вечнае мукі цяпер і заўсёды і на векі вечныя. Амінь». (Серада раніцай).

А вось як Кірыл зьвяртаецца да сьвятога Апостала Пятра:

«Сьвяты Пятро — першапрастольны, цьвёрды камень веры, непарушная аснова царквы, пастыр разумнага стада Хрыстовага, ключар каралеўства нябеснага, лоўца ў глыбіні, якая пераходзіць ўсякае ўяўленьне! Малю цябе, уседастойны: зрабі, каб абняла мяне Боская сетка, і выцягні мяне з згубнай глыбіні. Я ведаю цябе, што ты атрымаў ад Бога ўладу зьвязваць і разьвязваць: разьвяжы, прашу, мяне зьвязанага грэшнымі путамі і пакажы міласэрдзе тваё на мне, убогім тваім слузе. Ажыві маю пакорную душу, як некалі ты падняў з мёртвых Тавіту; пастаў мяне на добры шлях, як некалі ты паставіў з пасьцелі кульгавага у Красных Варотах. Ты ценям сваім праганяў немачы і хваробы: хай падзе на мяне цень тваей дабраты, што праганяе духовыя хваробы і цялесныя слабасьці. Ты ўсё можаш, сьвяты, сілаю Хрыста, дзеля Якога ты пакінуў усё і, палюбіўшы Яго, пайшоў усьлед за ягонымі стапамі, і за Ягонае сьвятое Імя насіў путы. Памаліся да Яго за мяне няшчаснага, каб я мог выбавіцца тваімі малітвамі ад усякага зла». (Чацьвер раніцай).

Такім чынам, ня гледзячы на пакутны характар малітваў сьвятога Кірыла, у іх адсутнічае дух безнадзейнасьці і роспачы. Наадварот, яны поўныя хрысьціянскага аптымізму, які мае сваю аснову ў цьвёрдай веры ў бесканечнае Божае міласердзе. Дзеля гэтага глыбокі і шчыры жаль за грахі ёсьць злагоджаны ціхай духовай радасьцю. Гэтая радасьць выліваецца часамі ў натхнёную песьню хвалы Богу, як у гэтай кароткай малітве: «Зрабі мяне дастойным, Госпадзе, убачыць ранішнюю зару і сонца і, пры Тваей дапамозе, захавацца ад грэху; і дай, каб я мог славіць, Уладару, Тваю Дабрату. Ты стварыў увесь гэты прыгожы сьвет на службу для нас грэшнікаў: зрабі і мяне дастойным гэтых Тваіх дараў. Малюся Табе, літасьцівы Госпадзе, дай, каб адзін дзень я мог аглядаць вечны, безканечны і нязьнішчальны сьвет Твайго Вобліку. Цяпер-жа, падбадзёраны ласкаю Тваею і ўзрадаваны Тваім міласердзем, усклікаю: слава Табе, сьвятая, адзінасутная, неразьдзельная і жыватворчая Тройца, Ойча, Сыне і Сьвяты Душа, цяпер і заўсёды і на векі вякоў. Амінь». (Субота вечарам).[37]

[37] Акрамя штодзённых малітваў, Кірылу прыпісваецца таксама некалькі «штодзённых вызнаньняў грахоў і памінаньняў» і «малітва на ісход душы». Некаторыя дасьледчыкі аднак сумняюцца ў аўтэнтычнасьці гэтых твораў. Вось для прыкладу вынятак з аднаго такога «вызнаньня і памінаньня»: «Спасі, Госпадзе, і зьлітуйся над тымі, што ненавідзяць і крыўдзяць мяне, чуюць да мяне варожасьць і робяць мне ўсякія прыкрасьці, а таксама тых, якія зьнеслаўляюць і абмаўляюць мяне. Няхай ніхто з іх не пацерпіць дзеля мяне недастойнага ніякім чы-нам ні ў цяперашнім веку, ні ў будучым, але Ты, Усядобры, ачысьці іх Тваім міласердзем і пакрый Тваею ласкаю». Калі-б гэтая кароценькая малітва сталася штодзённаю малітваю ўсіх хрысьціянаў, дык напэўна сьвет быў-бы лепшым месцам для жыцьця, чым ёсьць цяпер.

*

Каноны сьвятога Кірыла складаюць асобную групу ягонай гімнаграфічнай творчасьці. У адрозьненьне ад малітваў, яны зьяўляюцца творамі літургічнымі, прызначанымі для агульнацаркоўных службаў Божых.

Канон — гэта даволі складаны рэлігійны паэтычны твор, які паявіўся ў бізантыйскім абрадзе ў пачатку 8-га стаг. Першым тварцом канонаў лічыцца сьв. Андрэй Крыцкі (660 — 740). Ягоны «Вялікі Канон», які вызначаецца сваім выбітна пакутным характарам і цяразмернай даўжынёй, да гэтага часу сьпяваецца на ранішняй службе (утрані) ў пяты чацьвер Вялікага Посту.

Поўны канон складаецца з дзевяці песьняў, кожная з якіх мае чатыры, пяць або больш зваротак (трапароў). Спачатку каноны сьпяваліся толькі ў часе ранішняй службы (утрані) і песьні канону чаргаваліся з песьнямі з Сьвятога Пісьма, якія былі складовымі часткамі гэтай службы. Першая зваротка кожнай песьні канону — гэтак званы ірмас — павінна была служыць пераходам ад тэмы адпаведнай песьні з сьв. Пісьма да тэмы канону. Паколькі гэтыя дзьве тэмы звычайна ня былі зьвязаныя з сабою, дык зрабіць такі пераход ня было лёгкай справаю. Толькі вялікія мастакі слова маглі разьвязаць гэтае пытаньне шчасьліва і ўнікнуць штучнасьці.

З двух канонаў сьв. Кірыла, якія захаваліся; да сяньняшняга дня, найболын цікавым зьяўляецца ягоны «Канон Малебны». Пакутны дух гэтага твору

робіць яго асабліва прыдатным да Вялікапостных службаў. Вось першая песьня канону ў цэласьці:

«Ірмас.[38] Успамінаючы правіцу Майсея, уцякай, душа, з грэшнага Ягіпту, адкінуўшы няволю духовага Фараона, і, зрабіўшы крыж тваей падпорай, перайдзі пакорна мора пажаданьняў, усклікаючы: пяем песьню Госпаду, бо ён слаўны назьдзіў.

Я сам віню сябе ў злых маіх учынках, якімі я ўгнявіў Хрыста, пераступіўшы ягоныя прыказаньні. Сяньня-ж перадаю на пісьме ўсе мае думкі, словы і бясчынствы, усе маў агідныя бяспраўствы, каб сьвет пачуў аб іх.

Як доўга, бедная мая душа, ты будзеш спутана цялеснымі асалодамі, крыўдамі, бязьлітасьцю, гордасьцю і п'янствам. Гэта ўсё варожыя пасткі, якія зьвядуць цябе жывую ў пекла. Лепш, пакаяўшыся, усклікні: О Хрысьце мой! Разарві мае грэшныя путы і збаў мяне!

Цябе нязмоўкна хваляць вогненнымі галасамі войскі серафімаў, Найсьвяцейшая Тройца, Стварыцель усяго сьвету. І я прыбягаю да Цябе, просячы адпушчэньня маіх многіх грахоў. О Літасьцівы Стварыцелю: збаў мяне хоць у апошнюю хвіліну.

Як неразумныя дзевы, я ня маю лямпы пакаяньня і не запасься аліваю міласердзя, і таму дарэмна

---

[38] Каноны звычайна сьпаваюцца на адзін з васьмі літурлічных тонаў ведамых у бізантыйскай царкоўнай музыцы. Канон Малебны сьв. Кірыла сьпяваецца на тон пяты.

стукаю ў зачыненыя дзьверы. О Маці Божая, Ты збаў ад мукі маю няшчасную душу».

Пераход ад тэмы 1-шай песьні сьв. Пісьма (Выхад 15, 1-19) да тэмы канону ў ірмасе Кірыл зрабіў пры помачы прыраўнаньня ўцечкі душы ад грэху, да ўцечкі жыдоў з Ягіпту. Перадапошняя зваротка ёсьць у гонар Сьвятой Тройцы, а апошняя — ў чэсьць Багародзіцы. Гэты парадак захаваны у ўсіх песьнях канону.

Ірмас другой песьні гучыць так:

«Пачуй, неба, сказаў Майсей, напісаўшы другі запавет для тых, што пераступілі першы. Зразумей, душа, свой упадак: Бог справядлівы, Ён судзіць праведна і дае кожнаму паводле ягоных учынкаў».

Адпаведнай песьняй сьв. Пісьма ёсьць Песьня Майсея ў Другазаконьні (Др. Зак. 32, 1-43). Вось яе пачатак: «Слухай, неба, я буду гаварыць; слухай, зямля, словы вуснаў маіх... Імя Госпада праслаўлю: дайце славу Богу... Ён — цьвярдыня... Ён праведны і справядлівы. Але яны (г. зн. жыды) разбэсьціліся перад Ім, яны ня дзеці Ягоныя, род лянівы і разбэшчаны». (Др. Зак. 32, 1-5).

Трэці ірмас зьвязвае канон з песьняй Анны, маткі прарока Самуіла (1 Царств. 2, 1-10). Анна была бязьдзетнаю. Бог аднак пачуў яе малітву і даў ей сына, якога яна, паводле абяцаньня, ахвяравала Госпаду. Прынёсшы сына ў сьвятыню, Анна засьпявала хвалебную песьню, ў якой, між іншым, услаўляецца Божая магутнасьць: «Ніхто не сьвяты, акрамя Госпада; няма іншага (бога), акрамя Цябе,



*«Штодённыя Малітвы» выданыя ў Вільні ў 1601 годзе ў друкарні братоў Мамонічаў. У кнізе памешчаны малітвы съв. Кірыла Тураўскага.*

і няма цьвярдыні, акрамя Бога нашага... сытыя працуюць бяз хлеба і галодныя адпачываюць; нават бясплодная родзіць сем разоў, а шматдзетная занемагае. Гасподзь усьмяротлівае і ажыўляе, зводзіць уніз і ўзвышае» (1 Царств. 2, 2 і 5-6). Вобраз бяздзетнай Анны наводзіць нашага сьвятога на думку аб сваей душы, якая сталася бясплоднай, дзякуючы грахом. Ён просіць Бога, каб Той у сваей магутнасьці зрабіў яе зноў пладавітай:

«Ты, Божа, будучы ўсемагутным, зрабі зноў дабрародныммі маю зьняможаяую грахамі душу і маё апусьцелае сэрца: у пакоры духу прыношу Табе гэтую малітву».

Гэтых прыкладаў досьць, каб паказаць, як Кірыл умёў па, мастацку павязаць Біблійныя тэмы з тэмаю свайго канону. Наагул ягоны канон — як і ўсе іншыя творы, — ёсьць перапоўнены біблійнымі і евангельскімі вобразамі. Так, у прыведзенай вышэй апошняй зваротцы першай песьні, Кірыл выкарыстоўвае прыповесьць аб мудрых і неразумных дзевах (Мт. 25, 1-12). Лёс старазапаветнага Лямеха (Быцьцё 4, 23-24) дае яму повад да размышляньня над собскімі учынкамі.

«Як Лямех, вызнаю перад усімі мае грахі, а злых абычаяў маіх не пакідаю. Гора мне няшчаснаму, дастойнаму ўсіх мукаў».

У іншым месцы Кірыл прыраўноўвае грэшніка да згубленай драхмы (Лк. 15, 8-9):

«Ты, Хрысьце, ёсьць вельмі літасьцівы і не жадаеш сьмерці грэшніка: запалі ліхтар Твайго міласердзя і знайдзі мяне — Тваю драхму, — і,

пазваўшы сьвятых суседзяў, зрабі вясельле для ўсіх ангелаў і людзей».

Паводле свайго духу Малебны Канон сьв. Кірыла ёсьць вельмі блізкі да ягоных малітваў. Адчуваецца моцны ўплыў Вялікага Канону сьв. Андрэя Крыцкага, — асабліва ў выкарыстоўваньні біблейскіх вобразаў, — а таксама вялікапостных канонаў сьв. Тодара Студыта.[39]

Калі судзіць аб вартасьці малітвы паводле ейнае

---

[39] Другім ведамым канонам сьв. Кірыла ёсьць канон у гонар сьв. Ольгі, бабкі сьв. Ўладзіміра, якая прыняла Хрысьціянства ў 954 г. Рукапіс канону быў знойдзены і ўпершыню апублікаваны Нікольскім у 1907 г. (Никольский, ор. сіт. бб. 88-94). Ерэмін уважае, што няма прычыны сумнявацца ў аўтэнтычнасьці твору (Еремин, ор. сіт. б. 364). Магчыма Кірыл напісаў гэты канон з нагоды залічэньня Ольгі да ліку сьвятых і такім чынам ён нам дае прыблізную дату ейнае кананізацыі. Як трэба было спадзявацца, тон канону ёсьць урачысты і радасны, хоць з мастацкага пункту гледжаньня ён слабейшы за Канон Малебны. Вось ягоная першая песьня:

*Ірмас.* «Гордага Фараона з зброяю і коньнікамі Ты патапіў, а Ізаіля ўславіў і, правёўшы, па сушы, збавіў. Пяем песьню Хрысту, бо Ён слаўны назьдзіў.

Ты — наша веліч і слава, Ольга багамудрая: табою мы вызваліліся ад ідальскай спакусы. Сяньня маліся за род і людзей, якіх ты прывяла да Бога. Пяем песьню Хрысту, бо Ён слаўны назьдзіў.

Пышлівага чорта ты з Русі прагнала і бязчэсныя ідалы разрушыла, і ўсіх людзей ад беззаконьня вызваліла, мудра навучаючы іх. Пяем песьню Хрысту, бо ЁН слаўны назьдзіў.

Цемру грахоўную ты хростам абмыла і, адкінуўшы тленную нячыстасьць, Хрыста палюбіла: будучы цяпер разам з Ім, маліся за тых, якія вераю славяць цябе.

Ісаія Цябе жэзлам называе, Давід — тронам, Авакум — пакрытаю гарою, Майсей — кустом вогненным: мы-ж Цябе называем Багародзіцай».

У аднэй з вэрсіяў жыцьця сьв. Кірыла ў Пралёгу ўспамінаецца яшчэ ягоны «Вялікі Пакаянны Канон Госпаду паводле літараў альфабату» (гл. Творения, б. 296). Тэкст гэтага твору аднак не захаваўся.

здольнасьці парушаць людзкія сэрцы і накіроўваць думкі да Бога, дык трэба сказаць, што малітвы і канон сьв. Кірыла маюць гэтыя якасьці ў найвышэйшай ступені. Яны вызначаюцца глыбінёй і шчырасьцю рэгілійных пачуцьцяў. Іхнія высокія мастацкія вартасьці паказваюць, што аўтар меў немалыя паэтычныя здольнасьці. Гэта асабліва відаць у Малебным Каноне. Дзеля гэтага сьв. Кірылу Тураўскаму справядліва належыцца гонар быць першым і найвялікшым з усіх беларускіх старажытных паэтаў.

Высокія духоўныя і мастацкія якасьці малітваў і канонаў сьв. Кірыла былі прызнаныя ўсімі, хто меў нагоду пазнаёміцца з імі бліжэй. Нават Галубінскі, звычайна вельмі скупы на пахвалы, прызнае, што «адносна малітваў Кірыла Тураўскага, дык яны прадстаўляюць сабою надзвычай добрыя аратарскія творы, якія з усёй справядлівасьцю павінны заняць месца сярод найлепшых малітваў грэцкіх аўтараў».[40] Япіскап Макары аказаўся больш шчодрым у сваіх пахвалах: «Паводля стылю і зьместу, як канон, так і малітвы павінны быць залічаныя да найлепшых твораў гэтага роду, якія

[40] Гл. Е. Е. Голубинский, История Русской Церкви, том I, поэтом I, Масква 1901, б. 841.


зри ꙗко мнѣ. Гни помилꙋи. Г҃,
и ѿпꙋщенїе.

МЛТВА В НЕДЕЛЮ,
ПО ЧАСѢ Х҃Ъ.

Бже всемогїи, и безначалныи бгъ. Высокїи црьславныи, владыко всеи тварїи, видимои и невидимои. Сѣдяи на херꙋвимѣхъ, и пѣваемы ѿ серафимъ. Тобѣ слꙋжатъ тысꙋща горнїи чинове. Молимыи ѿ аггелъ, и ѿ всеа силы покланяемы. И ниже

кая тварь съ страхомъ трепещетъ предъ тобою. Ты бо еси богъ единъ безъгрѣшенъ.
Не презри мене молѧщагосѧ въ годинꙋ шестꙋю сего дне, въ нюже явлсѧ апломъ своим по въскресенїи. Печалнымъ сꙋщимъ, и премѣни скорбь на радость, показанїемъ [illegible] ти рꙋкꙋ и ребръ. Премѣни мою скорбь ѿ держащюмѧ мнѣ. Избави печали грѣховныѧ. И не презри мене ꙗко молѧщагосѧ в час сеи, в оньже [illegible] дне [illegible] домꙋ твоемꙋ. Ты же [illegible]

Бачынка з кнігі «Штодзённыя Малітвы» і пачатак адной малітвы свв. Кірыла Тураўскага

толькі існуюць у Праваслаўнай Царкве».[41]

На Беларусі малітвы сьв. Кірыла былі настолькі папулярнымі, што ў канцы 16-га і першай палове 17-га стагодзьдзяў яны выдаваліся некалькі разоў друкам разам з выбранымі малітвамі розных грэцкіх Айцоў Царквы.[42]

Хоць, як ужо было сказана раней, малітвы сьв. Кірыла і ягоны канон ёсьць пакутныя па свайму зьместу, аднак у іх усюды выступае бесканечнае міласэрдзе Божае і Ягоная любоў да людзей, якія, як дзьве зоркі, зьзяюць сьвятлом надзеі для грэшніка і не даюць яму ўпасьці ў роспач. Дзеля гэтага мы можам назваць сьвятога Кірыла Тураўскага «Пяўцом Божага Міласэрдзя».

---

[41] Гл. Макарий, Сьвятой Кирилл еп. Туровский, как писатель. Исторические Чтения по языку и словесности Имп. Ак. Наук, Пецарбург 1857, б. 165.

[42] Вось поўны назоў кнігі ў тлумачэньні на сучасую беларускую мову: «Малітвы штодзённыя многіх сьвятых айцоў і настаўнікаў Царквы Хрыстовай, выбраныя ўкароткасьці з грэцкага пісьма; і іншыя малітвы на ўвесь тыдзень сьвятога манаха Кірыла». Кніга вышла ў Вільні і мела некалькі выданьняў.

## IV

## ЗАЛАТАВУСНЫ

З усіх твораў сьвятога Кірыла найбольш ведамымі зьяўляюцца ягоныя казаньні. Яны Захаваліся ў вялікай колькасьці сыгіскаў, некаторыя з якіх паходзяць з XIII-га стагодздзя. Гэта адно сьведчыць ужо аб вялікай папулярнасьці твораў. Сам лік казаньняў ёсьць аднак невялікі. Сяньня ведамыя толькі восем казаньняў, якія без сумніву належаць пяру сьвятога Кірыла. Вось яны: казаньне[43] на Вербную нядзелю, на Вялікдзень, на нядзелю сьв. Тамаша (першая нядзеля пасьля Вялікадня), на нядзелю Міраносіцаў і Язэпа Арыматэйскага (другая нядзеля пасьля Вялікадня), на нядзелю расслабленага (трэцяя нядзеля пасьля Вялікадня), на нядзелю сьлепанароджанага (пятая нядзеля пасля Вялікадня), на Узьнясеньне і на нядзелю Сьвятых Айцоў (шостая нядзеля пасьля Вялікадня).

Такім чынам усе казаньні сьвятога Кірыла прыпадаюць на вялікодны пэрыяд, гэта значыць на найбольш урачысты час у літургічным календары. Вялікдзень зьяўляецца найвялікшым хрысьціянскім сьвятам. У Вербную нядзелю, а таксама ў нядзелі, якія беспасрэдна сьледуюць за Вялікаднем, Царква ў бізантыйскім абрадзе ўспамінае падзеі з жыцьця Ісуса Хрыста, дзе Ягоная боскасьць праявілася з

[43] У старабеларускай мове казаньні называліся «словамі».

найбольшай сілаю. Нядзеля Сьвятых Айцоў зьяўляецца быццам завяршэньнем гэтага кругу, бо ў гэты дзень сьвяткуецца памяць першага Агульнага Сабору ў Нікеі (325 г.), які супраць ерасі Арыя пацьвердзіў веру ў тое, што Хрыстос зьяўляецца Сынам Божым і сапраўдным Богам.

Як можна было спадзявацца, казаньні Кірыла, як і самыя сьвяты, носяць радасны і ўрачысты характар. Аўтар паставіў сабе за мэту «усхваліць», «уславіць», «узьвялічыць» сьвята.

Казаньні былі напісаныя без сумніву ў тым самым годзе. Адносна часу пэўнае паняцьце дае казаньне аб расслабленым, у канцы якога Кірыл кажа: «Гора таму, хто грэшыць пасьля прыняцьця духоўнага стану — гэта значыць пасьля манашаства і сьвятарства, — а нават самому япіскапу, які не баіцца Бога...». Тут напэўна намёк на справу Тодарца і таму гэтае і ўсе іншыя казаньні былі напісаныя не пазьней, чым у 1169 годзе.

Кожнае казаньне сьвятога Кірыла складаецца з трох частак: уступ; аснаўная частка, якая звычайна зьяўляецца паясьненьнем і разьвіцьцём евангельскай тэмы; і заканчэньне.

Уступ звычайна ёсьць вельмі кароткі. Ягоным заданьнем было зацікавіць слухачоў, зьвярнуць іхнюю ўвагу на тэму казаньня і даць аснову да разьвіцьця гэтай тэмы ў наступнай частцы, не апярэджваючы аднак яе.

У нядзелю Тамаша Кірыл пачынае казаньне такім чынам:

«Дзеля ўсхваленьня гэтага сьвята Царква

патрабуе вялікага настаўніка і мудрага прамоўцу. Мы-ж бедныя словам і мутныя розу-мам і ня маем боскага агню для складаньня словаў карысных для душы; аднак дзеля любові да братоў, якія тут ёсьць з намі, пастараемся сказаць што-небудзь карыснае аб абнаўленьні Хрыстовага уваскрасеньня».

А вось уступ да казаньня ў нядзелю сьлепанароджанага:

«Міласэрдзе Божае і чалавекалюбства Госпада нашага Ісуса Хрыста, і ласку Духа Сьвятога, дараваную шчодра людзкому роду, прапаведую вам, браты, добрыя хрысталюбівыя слухачы, дзеці Царквы, сыны сьвятла, прычасьнікі царства нябеснага. Аднак не ад свайго сэрца кажам гэтыя словы, — у грэшнай душы ня родзіцца ні добрая справа, ні слова карыснае, — але расказваем тое, што мы ўзялі з чытанага сяньня евангельля Яна Багаслова, сьведкі цудаў Хрыстовых».

На Узьнясеньне Господа Нашага Ісуса Хрыста аўтар, быццам няпэўны ў сваіх сілах, просіць прарока Захара памагчы яму уславіць так вялікае сьвята:

«Прыдзі сяньня духам, сьвяты прароча Захар, даючы пачатак нашаму казаньню ад тваіх прароцтваў аб узьнясеньні на неба Госпада Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста! Бо ты-ж паказаў нам гэта не ў прыповесьці, але яўна, кажучы: Вось Бог наш ідзе у славе, ад бітвы войска свайго, і ўсе сьвятыя з Ім; і стануць ногі Яго на гары Аліўкавай,

проста на ўсход ад Ерузаліму.[44] Хочам і ўсё апошняе ад цябе даведацца ...»

Абудзіўшы зацікаўленьне слухачоў, Кірыл пераходзіў да галоўнай часткі казаньня. Звычайна тэмаю служыла евангельле дня. Аднак кароткі евангельскі расказ Кірыл пашыраў, разьвіваў і, дзе магчыма, уводзіў у яго драматычны элемэнт, які вельмі ажыўляў казаньне. Тыповым прыкладам можа служыць казаньне на нядзелю Міраносіцаў і Язэпа Арыматэйскага. Евангельле сьв. Марка коратка гаворыць аб тым, як Язэп папрасіў у Пілата цела Хрыста і пахаваў Яго ў новым гробе. У Кірыла расказ пачынаецца лірычным плачам Багародзіцы, якая стаяла пры крыжы Хрыстовым:

«Усё стварэньне спачувае мне, Сыне мой, бачачы Тваю несправедлівую сьмерць. Гора мне, Дзіця маё, Сьвятло і Творча ўсяго, што існуе! Якія цярпеньні Твае мне трэба аплакваць сяньня: аплявухі і біцьцё па твары і па сьпіне; путы ў вязьніцы; ці аплёўваньне Твайго сьвятога твару, якое Ты прыняў за Тваю дабрату ад беззаконьнікаў? Гора мне, Сыне! Будучы нявінным, Ты быў зьняважаны і пацярпеў сьмерць на крыжы. Як яны сьмелі каранаваць Цябе цернямі, паіць воцтам і жоўцяй і прабіць дзідаю Твае усячыстыя рэбры!... Бачу Цябе, мілае дзіця, як Ты вісіш голы на крыжы, бяздушны, бяз выгляду і прыгожасьці, і душа мая горка крывавіцца. Я жадала-б памерці з Табою, бо не магу глядзець на Цябе бяздушнага. Няма мне больш ніякай радасьці,

[44] Гл. Зах. 14, 3-4. Цытата недакладная.

бо маё Сьвятло і Надзея і Жыцьцё, Сын мой і Бог на дрэве згаснуў. Дзе маё, Сыне, дабравешчаньне, якое мне некалі апавясьціў Гаўрыла, кажучы: “Радуйся, абрадаваная, Госпад з Табою”? ... Гора мне! Каго паклічу, каб плакаў са мною? З кім буду выліваць ручаі сьлёзаў? Усе Твае сябры і прыяцелі пакінулі Цябе, усе тыя, што карысталі з Тваіх цудаў. Дзе цяпер лік сямідзесяці вучняў? Дзе вярхоўныя апосталы? Адзін з іх Цябе хітрасьцю здрадзіў фарызэям, другі-ж, дзеля страху перад першасьвятарамі, выракся Цябе кажучы, што ня ведае гэтага чалавека. Я адна, Божа мой, служка Твая, стаю і плачу разам з ахоўнікам Тваіх словаў, Тваім улюбёным наперсьнікам. Гора мне, Ісусе мой, дарагое імя! Як гэта зямля стаіць, чуючы на сабе Цябе на крыжы павешанага... Прыдзіце, глядзіце на тайну Божага міласердзя, як Той, які ажывіў усё, сам памёр ганебнай сьмерцю».[45]

---

[45] «Плачы» былі шырока ведамымі у усходняй царкоўнай літаратуры. Найболыш распаўсюджанымі былі «плачы» Багародзіцы. Яны знайшлі свой адбітак у г. зв. «крэстабагародзічных» трапарах і ў песьнях службаў Вялікага Тыдня. Сярод іх цікавасьць прадстаўляе канон «на укрыжаваньне Госпада і на плач Багародзіцы». Аўтарам канону зьяўляецца грэцкі пісьменьнік Сымон Мэтафраст, ведамы таксама як Сымон Лягатэт, які жыў у палове 10-га стагодзьдзя. Вось некалькі трапароў з гэтага канону:

«Вось сьвятло маё салодкае і надзея і жыцьцё маё добрае, Бог мой згаснуў на крыжы, і сэрца маё крывавіцца, — кажа Дзева з плачам.

Бачачы Усячыстую ў горкіх сьлёзах, Язэп узрушыўся ўвесь і з плачам пайшоў да Пілата. Дай мне, — усклікнуў ён з сьлязамі, — цела Бога майго.

Бачу Цябе мёртвым, Чалавекалюбча, які ажывіў мёртвыя і трымаеш усё, і люта цярплю, — кажа Багародзіца. — Хацела-б памерці з Табою, бо не магу глядзець на Цябе бяздушнага і мёртвага».

Акрамя канону Сымон напісаў іншы твор, які завецца: «Плач Багародзіцы, калі яна абнімала цела Хрыста». (гл. Migne, Patrologia Graeca, Vol. 114, pp. 208-218).

Кірыл быў напэўна знаёмы з гэтымі творамі, або прынамсь з канонам. Іхні уплыў адчуваецца ў ягоным «плачы».

Гэты плач пачуў Язэп Арыматэйскі і падышоў да Багародзіцы. Убачыўшы яго, Багародзіца просіць яго пайсьці да Пілата і папрасіць цела Хрыста. Язэп, перамагаючы страх перад жыдамі, выконвае просьбу Багародзіцы. Ён ідзе да Пілата і просіць у яго цела Хрыста такімі славамі:

«Дай мне, ігемане, цела таго дзіўнага Ісуса, укрыжаванага між двумя разбойнікамі, абвінавачанага з зайздрасьці першасьвятарамі, зьняважанага бяспраўна жаўнерамі. Дай мне цела таго Ісуса, якога кніжнікі называюць Сынам Божым, а фарызэі клічуць цэзарам, і якому ты прыказаў прыбіць над галавою дошку з надпісам: Гэта Сын Божы і цэзар жыдоўскі. Дай мне цела Таго, каго собскі вучань, спакусіўшыся на серабро, выдаў сьвятарам... Прашу цябе аб целе Таго, аб кім Каяфа прадсказаў, што яму аднаму належыць памерці... Прашу цела таго Ісуса, які на тваё пытаньне адказаў: Я ёсьць сьвятло і праўда... Дай мне зьняць цела з крыжа, бо я хачу палажыць яго ў маім гробе ... »[46]

---

[46] У Эпіфана Кіпрскага (315-403) маецца падобная прамова Язэпа да Пілата. Вось выняткі з яе:

«... Дай мне на пахаваньне мёртвае цела таго засуджанага табою Ісуса Назарэя, Ісуса жабрака, Ісуса бяздомнага, Ісуса ўсімі бачанага голага, упакоранага, дзіўнага, няведамага сярод чужых, пагарджанага ўсімі... Дай мне цела гэтага дзіўнага, бо якая табе карысьць з гэтага цела... дай мне цела гэтага мёртвага, а разам і Бога, каб я мог пакрыць пакрыўшага мае бясчынствы; дай мне гэтага мёртвага, каб я мог пахаваць пахаваўшага ў Ярдане мае грахі...» (гл. F. Miklosich, Monumenta Linguae Paleoslovenicae e Codice Suprasliensi. Vindobonae 1851, pp. 343—344).

Казаньне Эпіфана было ведамае ў славянскім тлумачэньні ужо ў 11-ым стагодзьдзі і ўвайходзіла ў склад г. зв. Супрасьлскага Зборніку. Зборнік гэты, хоць небеларускага паходжаньня, зьяўляецца адным з найстарэйшых памятнікаў пісьменства на Беларусі.

Атрымаўшы ад Пілата цела Хрыста, Язэп разам з Нікодымам нясуць яго пахаваць, плачучы пры гэтым:

«Сонца незаходнае, Хрысьце, Творча ўсіх і Уладару ўсяго стварэньня! Як я пасьмею даткнуцца да Твайго ўсячыстага цела, да якога ня сьмеюць дакранацца нават нябесныя сілы... Якія песьні надгробныя сьпяваць буду Табе, каго на небе нязмоўкна славяць серафімы! Як я панясу на руках маіх Цябе, Нявідзімага Уладара, які сілаю сваею носіць усё стварэньне? Як я палажу ў маім бедным гробе Цябе, які уцьвярдзіў круг нябесны і спачываеш на херувімах разам з Айцом і Сьвятым Духам...»[47]

Мінуўшы субоце, жанчыны-міраносіцы прышлі на гроб. Там яны ўбачылі ангела, які адкрыў ім тайну збаўленьня роду людзкога Хрыстом:

«... Хачу расказаць вам тайну Божай любові да людзей, як Ён пацярпеў за Адама, які упаў у тленьне. Дзеля яго Ён зыйшоў з неба і, прыняўшы

---

[47] Параўнай сьціхіру, якая сьпяваецца ў Вялікую Пятніцу на вячэрні на вынас плашчаніцы:

«Бачачы Цябе, які апранаецца сьвятлом як вопраткай, голага, мёртвага і непахованага, Язэп з Нікодымам, узьняўшы шчыры плач, казаў: Гора мне, салодкі Ісусе! Убачыўшы Цябе павешанага на крыжы, сонца пецямнела і зямля з страху затраслася і царкоўная заслона разадралася. Бачу Цябе сяньня дзеля мяне дабравольна прыняўшага сьмерць. Як я пахаваю Цябе, Божа мой? Якою плашчаніцаю спаўю Цябе? Якімі рукамі дакрануся да Твайго нятленнага цела? Якія песьні сьпяваць буду, хаваючы Цябе, Усядобры?..».

цела, стаўся чалавекам, каб загінуўшага абнавіць і ўзяць з сабою на неба. Той (г. зн. Адам), паслухаўшы рады ворага, захацеў стаць богам і быў пракляты; гэты-ж (г. зн. Хрыстос) паслухаўся Айца і, будучы Богам, стаўся чалавекам, каб зьнішчыць зьмея і зрабіць чалавека богам. Той, працягнуўшы руку да забароненага дрэва, сарваў сьмяротны плод і, стаўшыся нявольнікам граху, зышоў з раю ў пекла. Хрыстос, распасьцёршы рукі на крыжы, асвабадзіў людзей ад прысуду грахоўнага і ад сьмерці...»[48].

Казаньне канчаецца пахвалаю Язэпу Арыматэйскаму.

Тон у дыялягах сьвятога Кірыла мяняецца цэлы час у залежнасьці ад нагоды і бывае то паважны і

---

[48] Параўнаньне Адама і Хрыста, вельмі пашыранае у сьвятаайцоўскай літаратуры, бярэ свой пачатак ад сьв. Паўла, у якога спатыкаюцца выражэньні, як: «Як праз праступак аднаго ўсім людзям асуджэньне, гэтак праз праведнасьць аднаго ўсім людзям апраўданьне на жыцьцё» (Рым. 5, 18); або: «Як у Адаме ўсе паміраюць, так у Хрысьце ўсе ажываюць» (I Кар. 15, 22).

У раньняй усходнеславянскай царкоўнай літаратуры было ведамае «слова (казаньне) аб Адаме і Хрысьце», бізантыйскага паходжаньня. Яно было нават устаўлена у «казаньне аб законе і ласцы» кіеўскага Мітрапаліта Іларыёна (прыб. 1051). Вось вынляткі з яго:

«Дзеля таго Хрыстос радзіўся ад чыстае Дзевы, бо Адам быў створаны з чыстае зямлі; паколькі Адам, дасканалы чалавек, саграшыў як дзіця, дзеля таго Хрыстос прыгвазьдзіў цела сваё на крыжы, каб аздаравіць Адама, параненага сьмяротным дрэвам; Дзеля таго Хрыстос прыгвазьдзіў рукі да крыжа, бо Адам руку працягнуў да дрэва ... дзеля таго Хрыстос спробаваў воцту і жоўці, бо Адам соладка еў... (гл. Ф. Г. Калугин, Илларион Митрополит Киевски; у кніве: А. М. Пономарев, Памятники древнерусской церковно-учительной литературы, Вып. I, СПб. 1894, бб. 83-84).

урачысты, то поўны паэтычнага лірызму. Часам ён нават набывае характар звычайнай штодзённай размовы, як напрыклад у выпадку расслабленага, які на запытаньне Хрыста, ці хоча быць здаровым, расказвае Яму ўсе свае няшчасьці:

«Так... Госпадзе! Хацеў-бы, але ня маю чалавека, які-б мяне укінуў у купелю пасьля таго, як ангел усхвалюе ваду. Але паколькі Ты запытаў мяне аб здароўі, Уладару, дык паслухай майго кароткага адказу, каб я мог Табе расказаць усе мае няшчасьці і хваробы. Трыццаць і восем гадоў я ляжу прыкованы да гэтай вось пасьцелі... Я затраціў на лекараў усю маю маемасьць, але не атрымаў ніякага аблягчэньня, бо няма такога зельля, якое-б супроцьдзеяла кары Божай. Мае знаёмыя брыдзяцца мною, бо мой смурод робіць мяне няпрыемным, а мае сваякі саромяцца мяне і я стаў чужым для маіх братоў. Магчыма я памёр? Але-ж жывот мой есьці хоча і язык сохне ад смагі. Дык можа я жывы? Але-ж я не магу ня толькі ўстаць з ложка, але нават паварухнуцца: маю ногі, якія ня ходзяць, і рукі, якімі ня толькі не магу нічога рабіць, але нават дакрануцца. Я — непахованы труп, а гэты ложак — мой гроб. Я мёртвы сярод жывых і жывы сярод памершых, бо, як жывы, хачу есьці і, як

мёртвы, не магу нічога рабіць...»[49].

Выслухаўшы ўсе жалі расслабленага, Хрыстос адказвае:

«... Як гэта ты кажаш: Ня маю чалавека? Я-ж дзеля цябе стаўся чалавекам, шчодры і міласьцівы, і не зламаў абяцаньня уцелаўленьня.. . Дзеля цябе, пакінуўшы сцэптр вышняга каралеўства, я хаджу, служачы тым, што жывуць унізе: бо я не прышоў, каб мне служылі, але каб служыць. Дзеля цябе Я, будучы безцялесным, прыняў цела, каб аздаравіць усіх ад духовых і цялесных немачаў. Дзеля цябе Я, будучы нявідзімым для нябесных сілаў, явіўся ўсім людзям, бо Я не жадаю пагарджаць маім вобразам, што ляжыць у заняпадзе, але хочу прывесьці ўсіх да пазнаньня праўды. А ты кажаш ня маю чалавека! Я стаўся чалавекам, каб чалавека богам зрабіць, бо сказаў: багамі будзеце і сынамі Усявышняга.[50] Хто-ж служыць табе больш верна, чым Я?...»[51].

---

49 У прамове адчуваецца уплыў літургічных тэкстаў дня. У песьнях на вячэрні на нядзелю расслабленага чытаем:

«Я непахованы труп, — усклікнуў расслаблены, убачыўшы Цябе. — Зьлітуйся нада мною, Госпадзе, бо гэты ложак ёсьць маім гробам.

Хворы адказаў: чалавека ня маю, каб, калі усхвалюецца вада, укінуў мяне ў купелю. Лекарам аддаў я ўсю маю маемасьць, але ласкі атрымаць не удастоіўся». Намёк на лекараў адсутнічае ў евангельскім расказе аб расслабленым (Ян 5, 1-15). Ён напэўна ўзяты з расказу аб жанчыне, хворай крывацёкам (Мк. 5, 26 і Лк. 8, 43).

50 Гл. Псал. 81, 6; таксама Ян 10, 34.

51 Параўнай прамову Хрыста з сьціхірай на ліцьці на вячэрні у нядзелю расслабленага:

«Зьлітаваўшыся, Збавіцель кажа яму (г. зн. расслабленаму): Дзеля цябе Я стаўся чалавекам, дзеля цябе я прыняў цела, а ты кажаш: Чалавека ня маю...»

Гэты адказ Хрыста, а таксама вышэй прыведзеная прамова ангела да міраносіцаў, належаць да найбольш велічных рэчаў напісаных сьвятым Кірылам. У іх ён разьвівае вучэньне аб усеагульным збаўленьні роду людзкога цераз Хрыста. Паводле стылю і зьместу іх можна паставіць з найлепшымі прыкладамі усходняга сьвятайцоўскага пісьменства.

Драматызацыя у творах сьвятога Кірыла праяўляецца ня толькі ў дыялёгах, але таксама ў апісаньні дзеяньня. Найлепшым прыкладам гэтага можа служыць казаньне на Узьнясеньне, якое трэба лічыць вяршыняю ягонага красамоўнага мастацтва. Дзеяньне пачынаецца на Аліўкавай гары, дзе разам з Хрыстом зьбіраецца ўся Царква: патрыярхі, апосталы, вучні і вялікая грамада верных. У тым самым часе ангелы на небе рыхтуюцца да прыняцьца Хрыста: «Адны прыносяць на крыльлях хмару дзеля ўзьняцьця з зямлі Госпада Ісуса Хрыста Бога нашага, іншыя рыхтуюць херувімскі трон. Бог Айцец чакае Таго, каго меў з сабою ад пачатку, а Сьвяты Дух загадвае ангелам: Адчыніце нябесныя вароты, і хай увойдзе Цар славы». Усюды пануе рух і радаснае чаканьне вялікага здарэньня... На гары апосталы, бачачы, што Хрыстос іх хутка пакіне, просяць жаласьліва: «Не пакінь нас, Уладару, сіротамі, каго Ты ў міласердзі Тваім дабравольна палюбіў, але пашлі нам Духа Твайго Сьвятога, якога Ты нам абяцаў». Наканец Хрыстос, пацешыўшы вучняў і паблагаславіўшы іх, пачынае узносіцца на неба:

«Перад Ім ішлі ангельскія сілы, з страхам і радасьцю, хочучы адчыніць нябесныя вароты; аднак нябесныя вартаўнікі ня пушчалі іх, кажучы: “Гэта вароты господнія і ніхто з зямных імі ўвайсьці ня можа, бо так нам загадаў Бог, каб ніхто сюдэю не прайшоў. Цяпер-жа дзівімся, бачачы чалавека, які сядзіць на херувімскім троне і жадае ўвайсьці цераз гэтыя вароты перад сэрафімамі”. Тады ангелы аб'явілі ім Божую сілу і годнасьць, якая знайходзіцца ў гэтым чалавечым целе, і загадалі не праціўіцца волі Бога, які ўсё мудра стварыў. “Бо Ён, — казалі яны, — зыйшоў на зямлю нябачаны нікім і цяпер вось ўзыйходзіць зноў у выглядзе слугі”. Яны аднак адказалі: “Не паслухаемся, пакуль не пачуем Божага загаду”. Тады сам Хрыстос усклікнуў: “Адчыніце мне вароты праўды, каб, увайшоўшы, Я мог расказаць Айцу майму, што Я рабіў і як цярпеў на зямлі". Пазнаўшы голас Госпада, усе сілы нябесныя, упаўшы, пакланіліся Яму і сказалі: “Хоць мы і ня бачылі, Уладару, як Ты зыйходзіў (на зямлю), але пакланяемся Табе цяпер калі Ты ўзыйходзіш у славе”».

Кірыл упрыгожваў свае казаньні рознымі красамоўнымі хвормамі і зваротамі. Сярод іх ён часта ужываў антытэзу, або супроцьстаўленьне. Такім чынам ён супрацьстаўляе Хрыста і Адама ў прыведзенай вышэй прамове ангела да міраносіцаў. Вось яшчэ адзін прыклад, узяты з казаньня на Вялікдзень:

«Перад учарашнім днём Хрыстос быў

укрыжаваны як ч а л а в е к, але як Б о г зацьміў сонца і месяц акрываваіў і цемра зрабілася на зямлі; як ч а л а в е к, Ён, усклікнуўшы, аддаў дух, але як Б о г Ён ўстрасянуў зямлёю, так што камні распаліся; як ч а л а в е к Ён быў прабіты дзідаю ў рэбры, але як Б о г заслону першага закону разадраў напалову... як ч а л а в е к Ён быў паложаны ў гробе, але як Б о г асьвяціў аўтар паганскай царквы...»[52]

Іншым частым прыёмам Кірыла было паўтарэньне. У казаньні аб сьлепанароджаным, калі Хрыстос спаткаў чалавека, якога Ён аздаравіў і запытаў яго, ці верыць у Сына Божага, той адказаў:

«В е р у , Госпадзе, і кланяюся Табе! В е р у ў

[52] У Іларыёна, Мітрапаліта Кіеўскага, чытаем: «(Хрыстос)... як чалавек прышоў хрысьціцца, але Ярдан спужаўся Яго, як Бога, і павярнуў назад; як чалавек, прыйшоў Ён на вясельле ў Кану Галілейскую, але, як Бог, перамяніў ваду ў віно... Як чалавек быў укрыжаваны, але як Бог упусьціў у рай укрыжаванага разам з Ім; як чалавек спробаваў воцту і аддаў дух, але як Бог зацямніў сонца і затрос зямлёю; як чалавек быў паложаны ў гробе, але як Бог разбурыў пекла і вызваліў душы ...» (гл. Кулагин, ор. сіт. бб. 64-65).

Старажытныя пісьменьнікі любілі супастаўляць людскую і боскую натуры Хрыста, і ў ягоным дабравольным упакарэньні бачылі, зусім слушна, доказ бязьмернай любові Бога да людзей.

Іларыён быў першы кіеўскім мітрапалітам нягрэцкага паходжаньня (прыбл. 1051—1054). Ён аставіў па сабе адзін твор, які завецца «Слова (казаньне) аб законе і ласцы». Судзячы па ім, Іларыён быў адзіным раньнім усходнеславянскім царкоўным пісьменьнікам, які сваімі здольнасьцямі і ведамі мог раўняцца з Кірылам Тураўскім.

Цябе, Сыне Божы, і слаўлю Цябе! В е р у, Уладару, і вызнаю Цябе, як Збаўцу Хрыста! В е р у, Міласерны, у Твой прыход на зямлю і Твой узыход на неба з чалавекам! Т ы ё с ь ц ь т о й , аб якім пісалі прарокі, убачыўшы духам Тваё уцелаўленьне! Ты ёсьць той, якога патрыярхі прадбачылі ў вобразе ягняці, узяўшага на сябе грахі сьвету! Т ы ё с ь ц ь , Госпадзе, т о й самы, аб якім вучылі заканадаўцы: 'Калі прыдзе Мэсыяш, Ён уняважніць Закон і падасьць ласку' ...»

У казаньні на нядзелю Тамаша Кірыл мае надзвычай прыгожае апісаньне веснавога адраджэньня прыроды, як сымбалю аднаўленьня ўсяго стварэньня цераз Хрыстовае зьмёрт-выхустаньне:

«Сяньня вясна красуецца, ажыўляючы зямную прыроду, і бурныя вятры, ціха павяваючы, прыносяць багацьце пладоў, а зямля, кормячы семя, родзіць зялёную траву... Сяньня нованароджаныя ягняты і цяляты хутка бегаюць і скачуць па пасьцьбішчы і весела вяртаюцца да сваіх матак, а пастухі на жалейках радасна Хрыста славяць ...»

Вельмі магчыма аднак, што гэты вобраз вясны быў напісана ня столькі ў выніку назіраньня прыроды ў аколіцах Турава, сколькі пад уплывам падобных апісаньняў у творах сьв. Рыгора Наз'янскага (329-389).[53] Кірыл у пэўнай меры псуе

[53] Аб уплыве Рыгора Наз'янскага на Кірыла Тураўскага глядзі: Andre Vaillant, Cyrille de Turov et Gregoire de Nazianze, Revue des Etudes Slaves, Tome 26, Paris 1950, pp. 34-50.

мастацкі эфэкт, даючы вобразу алегарычнае тлумачэньне:

«Вясна — гэта вера Хрыстова, якая праз хрост родзіць нанова людзкую натуру; бурныя вятры — гэта грэшныя пажаданьні, якія цераз пакуту ператвараюцца ў цноты і прыносяць плады карысныя для душы; зямля-ж — гэта наша натура, якая, прыняўшы семя слова Божога... родзіць у страху дух збаўленьня...»

Кірыл быў чалавекам свайго часу і таму, пры ўсіх сваіх здольнасьцях, ня мог пазбыцца заганаў, якія панавалі ў тагачаснай бізантыйскай і усходнеславянскай літаратурах. Адной з такіх заганаў было церазмернае ужываньне алегорыі. Алегорыя, або іншасказаньне, — гэта спроба знайсьці іншы, «глыбейшы», сэнс у штодзенных зьявах. Яна мае сваё законнае мейсца і зьяўляецца неад'емнай часткай прыповесьці. Церазьмернае аднак яе ўжываньне ўводзіць у твор элемэнт штучнасьці і адарванасьці ад жыцьця. Бізантый-скія царкоўныя пісьменьнікі часу сьв. Кіры-лы надужывалі алегорыяй. Тое самае рабілі і беларусы і украінцы. Клімэнт Смалящіч у сваім пісьме да сьвятара Тамаша пісаў: «Я хочу ведаць іншасказальна цуды Хрыстовыя, апісаныя ў Евангельлі». Сьвяты Кірыл ня быў выняткам у гэтым, хоць у ягоных творах спатыкаецца меньш штучнасьці і алегорыі, чым у іншых аўтараў.

Кірыл канчае звычайна свае казаньні кароткай пахвалой Богу і сьвяту. Вось заканчэньне казаньня на нядзелю Тамаша:

«Таму, браты, верым Хрысту Богу нашаму, укрыжаванаму паклонімся, зь мёртвых устаўшага уславім, явіўшамуся апосталам верым і пяем паказаўшаму рэбры Тамашу, прышоўшага ажывіць нас усхвалім, вызнаем асьвяціўшага нас, узьвялічым падаўшага нам багацьце дабротаў, пазнаем адзінага ад Тройцы Госпада і Бога і Збаўцу нашага Ісуса Хрыста, якому слава з Айцом і Усесьвятым Духам».

Акрамя сваей кароткасьці, гэтае і іншыя заканчэньні казаньняў сьвятога Кірыла зьвяртаюць на сябе ўвагу адсутнасьцю маральнага павучэньня. У гэтым беларускі Залатавусны розьніўся вельмі ад сьв. Яна Залатавуснага (347 — 407). Вялікі Архіепіскап Канстантынопальскі быў слаўны з таго, што стараўся заўсёды і ўсюды датарнаваць навуку Хрыстовую да патрэбаў штодзённага жыцьця, асабістага і грамадзкага. Гэта знайшло моцны адбітак у ягоных казаньнях, дзе маральнае павучэньне, пасьля паясьненьня сьвятога Пісьма, было неад'емлемай складовай часткаю. У сьвятога Кірыла нічога падобнага не спатыкаецца. Ён падыходзіць найбліжээй да практычнага павучэньня пры канцы свайго казаньня на вербніцу:

«Дык вось, браты, выпадае нам, як людзям Божым, уславіць Хрыста, які палюбіў нас. Прыдзіце і паклонімся Яму і прыпадзем у думках, як блудніца, цалуючы ягоныя чыстыя ногі; адрачэмся, як яна, ад дрэнных дзеяньняў; вылілем ня ягоную галаву, як міра, нашу веру і любоў; выйдзем, як тады народ, насустрач Яму і зломім, як галіны, наш гнеў. Пасьцелем Яму, як вопратку, нашыя добрыя

учынкі; усклікнем Яму ў малітвах бяз злосьці, як малыя дзеці; пойдзем перад Ім, паказваючы міласердзе да бедных... Падрыхтуем, як ізбу, у пакоры нашыя душы, каб Сын Божы ўвайшоў туды пад відам прычасьця і зрабіў там вячэру з вучнямі сваімі... Умяртвім пажаданьні цялесныя; усклікнем: Асанна у вышніх! Благаславёны Той, хто прышоў на дабравольнае цярпеньне, які Ён зьнішчыў пекла і перамог сьмерць».

Гэтае павучэньне ёсьць аднак збыт агульніковае, каб мець якое практычнае значэньне. Наагул казаньні сьвятога Кірыла робяць уражаньне радасных гімнаў душы, прызвычаенай да сталага разважаньня над тайнамі Божымі, у чэсьць Усявышняга. Безумоўна, характар сьвятаў, для якіх яны былі прызначаныя, надаваўся вельмі добра да такога ты-пу казаньняў. Найбольш аднак тут хіба заважыў духовы склад самога аўтара.

Зрэштаю казаньні сьвятога Кірыла, узятыя ў цэласьці, ня ёсьць пазбаўленыя навучальнага элемэнту. Можна нават сказаць, што мэтаю Кірыла было збудаваць слухачоў, даць і духовую страву. Дзеля гэтага у ўсіх ягоных казаньнях, ня меньш чым у малітвах, ёсьць стала прысутная думка аб Божым міласердзі і аб Ягонай любові да людзей. Гэтае міласердзе праяўляецца асабліва ў дзеле адкупленьня роду людзкога Хрыстом, які «прышоў ня толькі дзеля праведных, але каб узьняць увесь упаўшы праступны сьвет, бо Ён узяў грахі ўсіх і прыгвазьдзіў іх да крыжа». (казаньне на Вялікдзень).

«Вось мудрасьць Божая і ягоная невымоўная любоў да людзей, — усклікае Кірыл у іншым месцы. — Якая душа ня радуецца аб Ягоным міласэрдзі, якім Ён нас палюбіў і прыблізіў да сябе, калі мы былі далёка ад Яго» (казаньне на нядзелю сьлепанароджанага).

Да навучальнага элемэнту трэба таксама аднесьці вобраз Язэпа Арыматэйскага, які, перамагаючы страх перад жыдамі, аддае апошнюю паслугу Хрысту.

Кірыл разьвівае ў сваіх казаньнях пэўныя багаслоўскія тэмы, сярод якіх параўнаньне і супрацьстаўленьне паміж часамі старога і Новага запаветаў займае віднае месца:

«... Ідаласлужэньне адышло ўжо і крыжовая тайна перамагла бясоўская насільле, а род людзкі ня толькі збавіўся, але і асьвяціўся вераю Хрыстоваю. Пасьля адмены ахвяры казьлянят і цялячай крыві Стары закон абяднеў; адзін Хрыстос цяпер прынёс сябе за ўсіх Айцу ў ахвяру» (казаньне на нядзелю Тамаша).

Вось яшчэ прыклад:

«... Мінуў ужо Стары закон з патрабаваньнем казьліных ахвяраў і запаветамі старцаў, ня могучы аздаравіць людзкіх недамаганьняў; закон Майсея нічога не асягнуў, а толькі аддаў усіх пад грэх. Цяпер сам Тварэц і Заканадаўца прышоў абнавіць стварэньне і збавіць чалавека, як кажа аб Ім прарок: Не заступнік і не ангел, але сам Госпад збавіў нас» (казаньне на нядзелю сьлепанароджанага).

Гэтая самая думка зьяўляецца асноваю

параўнаньня купелі у Бэтсаідзе з хростам у казаньні на нядзелю расслабленага:

«... (У Бэтсаідзе) ангел господні, прыйшоўшы, хваляваў ваду і той, хто першы ўвайходзіў у яе пасьля гэтага, рабіўся здаровым. Гэта быў вобраз сьвятога хросту, бо не заўсёды вада гэтая аздараўляла, але тады, калі яе парушаў ангел. Цяпер-жа у купелі хросту сам уладар ангелаў, Сьвяты Дух, прыходзіць і асьвячае яе, даючы здароўе для душаў і целаў і ачышчэньне грахоў. Калі хто сьляпы розумам, ці кульгае бязверрам, ці засох у роспачы басчынстваў, ці спараліжаваны хвальшывай навукаю — усіх вада хросту аздараўляе. Тая купеля ўсіх прыймала, але толькі аднаго аздараўляла, і то не заўсёды, а адзін раз у год, — а купеля хросту кожны дзень многіх аздараўляе і ажыўляе. Нават калі людзі з усёй зямлі прыдуць да хросту, ласка Божая гэтым не паменьшыцца і ўсе атрымаюць аздараўленьне ад грахоўных немачаў».[54]

---

[54] Параўнаньне Бэтсаіды з хростам знайходзіцца ўжо у сьв. Яна Залатавуснага:

«... Так як тады (г. зн. у Бэтсаідзе) не вада сама лячыла, — бо інакш рабіла бы гэта заўсёды, — але моц ангела, таксама і ў нас ня проста вада, але вада пасьля атрыманьня ласкі Сьвятога Духа робіцца здольнай змыць грахі... Тады слабасьць магла перашкодзіць таму, хто шукаў выздараўленьня. Цяпер усе маюць поўную свабоду прыбліжацца, бо не ангел ужо варушыць ваду, але сам Уладар ангелаў усё дзейнічае... Нават калі-б увесь сьвет прыйшоў, ласка ня зьменьшыцца, як і ня зьменьшыцца яе моц, але заўсёды астанецца той самай». (гл. Migne, Patrologia Graeca, Vol.. 59, p. 203).

За Янам Залатавусным гэты самы прыклад паўтарыў Тэафілякт Баўгарскі, грэцкі царкоўны пісьменьнік з пачатку 12-га стагодзьдзя (гл. Migne, Patrologia Graeca, Vol.. 123, pp. 1257—1260).

Кірыл быў напэўна знаёмы з творамі гэтых пісьменьнікаў.

Такім чынам навучальны элемэнт у казаньнях Кірыла не адсутнічае і ў іх нават адчуваецца жаданьне аўтара задаволіць духовыя патрэбы сваіх слухачоў. Толькі ў выкананьні гэтага жаданьня Кірыл паказаўся ў першую чаргу паэтам...[55]

У казаньнях сьвятога Кірыла адчуваецца шчасьлівае спалучэньне выдатных пісьменьніцкіх здольнасьцяў з абшырнымі ведамі. Кірыл быў без сумніву адным з найлепшых знаўцаў Сьвятога Пісьма сярод тагачасных усходнеславянскіх царкоўных пісьменьнікаў. Ня горш ён ведаў і грэцкіх айцоў царквы. Часамі нават маецца ўражаньне, што ягоныя казаньні належаць да сьвятаайцоўскай пары — так яны прасякнуты ейным духам — а не да 12-га стагодзьдзя. Асабліва

---

[55] Галубінскі, які так пахвальна адазваўся аб малітвах Кірыла, вельмі строга асудзіў ягоныя казаньні, бачучы ў іх толькі пустую рыторыку (гл. Голубинский, op. cit. бб. 797-798). Ніхто з іншых вучоных не згадзіўся з ягонымі поглядамі. Цікавая ёсьць думка Сухамлінава, аднаго з першых сур'ёзных дасьледчыкаў творчасьці сьв. Кірыла:

«Паясьненьні, а таксама і апісаньні, Кірыла Тураўскага вызначаюцца наіўнасьцяй і пэўнай гульнёй выабразьні ў адрозьненьне ад бізантыйскіх (твораў), пабудаваных паводле схаластычных узораў і нудных у сваей аднастайнасьці. Вывады, робленыя бізантыйцамі ў іхніх рытарычных практыкаваньнях, астаюцца без ніякіх адносінаў ня толькі да жыцьця, але нават да маральнасьці ў самым шырокім значаньні гэтага слова. З сучаснага пункту гледжаньня Кірыл Тураўскі можа выдацца дагматыкам у пераважнасьці. Аднак параўнаньне з бізантыйскімі узорамі паказвае, што ён не забыў маральнай мэты і, як ні наіўныя ягоныя параўнаньні, яны ў большай частцы схіляюцца да таго, каб даць настаўленьне, а не аб'ясьненьне догматаў». (гл. Сухомлинов, op. cit. б. 292).

Трэба зазначыць, што існуе некалькі казаньняў, якія звычайна прыпісваюцца сьв. Кірылу, хоць няма упэўненасьці, што ён быў сапраўды іхнім аўтарам. Сярод іх ёсьць такія, як «казаньне аб царкоўным павучэньні» і «павучэньне аб чытаньні сьвятога пісьма». Калі Кірыл ёсьць сапраўды аўтарам гэтых твораў, дык ён зьяўляецца без сумліву майстрам ня толькі урачыстага, але і павучальнага прапаведаньня.

вялікі ўплыў на станаўленьне стылю Кірыла мелі творы айцоў «залатой пары» — сьв. Рыгора Наз'янскага, Эпіфана Кіпрскага і ў асаблівасьці Яна Залатавуснага.[56] Гэты уплыў быў дадатні і дзякуючы яму Кірылу удалося пазьбегнуць у вялікай меры той штучнасьці і пышлівасьці, якая панавала ў сучаснай яму царкоўнай літаратуры.

Як прыклад красамоўнага мастацтва, казаньні Кірыла былі надзвычайным зьявішчам. Багацьце вобразаў і разнастайнасьць стылістычных хвормаў уносілі ў іх жыцьцё і трымалі зацікаўленьне слухачоў у сталым напружаньні. Мова казаньняў надзвычай багатая і адзначаецца трапнасьцю параўнаньняў і прыкладаў. Усюды адчуваюцца, хоць у меншай меры, тыя самыя высокія паэтычныя якасьці, што і ў малітвах. Авеяныя духам шчырай любові Бога, казаньні зусім справядліва здабылі іхняму аўтару славу другога Залатавуснага, «які больш за ўсіх зазьзяў на Русі».

---

[56] Уплыў сьв.. Яна Залатавуснага на сьв. Кірыла адчуваецца ня столькі ў пераймaньні некаторых месцаў, сколькі у ўсіх характары творчасьці гэтага апошняга. Ваян слушна заўважыў, што Кірыл Тураўскі настолькі добра ведаў Яна Залатавуснага, што маецца цэлы час уражаньне, быццам ён пераймае ад яго даслоўна, у тым часе як ён толькі насьледуе ягоную манеру пісаньня. (гл. Vaillant, op. cit., p. 50).

## V

## ДОБРЫ ПАСТЫР

Амаль усё дарослае жыцьцё сьвятога Кірыла прайшло ў пастырскай дзейнасьці. Пачаў ён яе яшчэ ў манастыры, дзе быў для многіх духоўным настаўнікам. Апека і навучаньне паручаных яму Богам душаў сталіся ягонай галоўнай мэтай, калі ён быў пакліканы на Тураўскі япіскапскі пасад.

Кірыл меў высокае паняцьце аб япіскапскай годнасьці і зьвязаных з ею абавязках. Яму балела, калі бачыў, што нехта выкарыстоўвае япіскапскае становішча для недастойных мэтаў. Сумным прыкладам гэтага была без сумніву справа япіскапа Тодарца. Паколькі яна гразіла разьбіцьцём царкоўнай еднасьці ў Кіеўскай мітраполіі з вялікай шкодай для душаў, Кірыл ня мог аставацца з боку і маўчаць. З другой стараны ўсякая палеміка была для яго няпрыемнай. Разьвязка, якую ён знайшоў, гаворыць шмат аб ім, як чалавеку. Замест паніжацца да сваркі, Кірыл выкарыстаў справу Тодарца, каб напісаць твор, у якім ён мог-бы выясьніць свае погляды на Царкву і царкоўную ерархію. Такім творам была ягоная «Прыповесьць аб кульгавым і сьляпым». Кірыл выбраў тут алегарычны спосаб пісаньня, узяўшы за аснову ведамую ў усходнеславянскай царкоўнай пісьменнасьці прыповесьць, занесеную туды з усходніх, праўдападобна жыдоўскіх, крыніцаў. Пачынаецца яна тым, што «нейкі гаспадар пасадзіў вінаград,

агарадзіў яго плотам, выкапаў студню зрабіў вароты, але не зачыніў іх. Адыходзячы ён разважаў так: ,Каго я пастаўлю сьцерагчы мой вінаграднік? Калі пастаўлю аднаго з маіх слугаў, дык той, ведаючы маю дабрату, абкрадзе маю маемасьць. Вось што зраблю: пастаўлю пры варотах кульгавага, а разам з ім сьляпога. Калі-б які вораг захацеў увайсьці і абакрасьці вінаграднік, дык кульгавы яго ўбачыць, а сьляпы пачуе. Калі-ж нехта з іх саміх захоча ўвайсьці ў вінаграднік, дык кульгавы ня зможа гэтага зрабіць дзеля сваіх хворых ногаў, а сьляпы, нават калі і ўвойдзе, то заблудзіць і згіне». Аднак сторажы аказаліся хітрэйшымі, чым гаспадар думаў. Як толькі той адыйшоў, кульгавы сеў на сьляпога і пачаў паказваць яму дарогу. Такім чынам яны ўвайшлі ў вінаграднік і абакралі яго. Калі гаспадар даведаўся, аб тым, што сталася, ён паклікаў найперш сьляпога. Той яму адказаў: «Гаспадар, ты ведаеш, што я сьляпы і без правадніка ня ведаю куды ісьці і не магу сам трапіць у ніводнае месца, нават калі-б і хацеў. Я ня чуў нікога, хто-б прайходзіў міма мяне цераз вароты, бо інакш пачаў бы крычаць за ім. Думаю, гаспадар, што гэта кульгавы абакраў цябе». Тады гаспадар прыказаў пільнаваць сьляпога, аж пакуль ён не пакліча кульгавага. Калі-ж гэтых двух спаткаліся, яны пачалі абвінавачаць адзін другога: «Кульгавы сказаў: Калі-б ты мяне не насіў, я сам ня мог-бы зайсьці, будучы кульгавым',. Сьляпы-ж адказаў: ,Калі-б ты мне не паказваў дарогі, я-б туды сам зайсьці ня мог'». Наканец гаспадар, выслухаўшы іх,

прыказаў завесьці абодвух у вязьніцу на пакараньне.[57]

Вобраз гаспадара наводзіць аўтара на думку аб Богу, у тым часе як вінаграднік з адчыненымі варотамі — гэта вобраз Царквы. «Царква, — кажа Кірыл, — ёсьць для ўсіх адчыненая. Яна для нас ёсьць маткаю, якая родзіць нас у хросьце і корміць тых, што жывуць у ёй».

Падобна таму, як гаспадар паставіў сторажаў пры вінаградніку, так і ў Царкве Бог устанавіў

---

[57] Поўны назоў твору ёсьць: «Прыповесьць мніха Кірыла аб людзкой душы і целе, аб зьмёртвых-устаньні цела, і аб будучым судзе і муках».

Наагул «прыповесьць» зьяўляецца надзвычай цікавым творам, які прыцягнуў увагу такіх дасьледчыкаў, як Сухамлінаў (ор. сіг. бб. 318-325), Франко (ор.сіг. бб. 129-155) і Ерэмін (гл. М. Еремин, «Притча о слепце и хромце в древнерусской писменности», Изв. Отд. Русского Языка и Словесности АН СССР, т. 30, 1925, бб. 323-325).

У творы Кірыла ёсьць шмат дзіўнага і незразумелага. Напрыклад, ён лічыць сьв. Апостала Мацьвея аўтарам прыповесьці аб сьляпым і кульгавым. Безумоўна, пачатак прыповесьці мае некаторае падабенства да прыповесьці аб благіх вінаградарах (гл. Мт. 21, 31-40), аднак памылка Кірыла, які быў адным з найлепшых знаўцаў сьв. Пісьма ў сваім часе, астаецца незразумелай. Адно толькі ёсьць пэўным, што прыповесьць дайшла да Кірыла ўжо ў хрысьціянскай форме, а не з першапачатковых крыніцаў. Побач з тэмаю Царквы і царкоўнай ерархіі Кірыл разьвівае ў прыповесьці тэму пасьмертнага жыцьця. Сьляпец для яго зьяўляецца вобразам душы, а кульгавы — цела. Ён робіць вывад, што душы памерых не атрымоўваюць адразу кары або нагароды ад Бога, але чакаюць агульнага зьмёртвыхустаньня. Хоць такі погляд і спатыкаецца ў некаторы, асабліва ўсходніх, ранейшых царкоўных пісьменьнікаў (напр., сьв. Афрат Сырыйскі, Фоццы, Тэафілякт Баўгарскі), аднак ён пярэчыць традыцыйнай навуцы Царквы, паводле якой душы памершых атрымоўваюць адразу пасьля сьмерці ўзнагароду або пакараньне за свае учынкі. Гэтае вучэньне зьяўляецца асноваю культу сьвятых, душы якіх ужо цяпер жывуць шчасьліва з Богам у небе. А мы бачылі, што Кірыл адзначаўся вялікай пабожнасьцю да сьвятых.

ерархаў, каб сьцераглі сьвятых тайнаў:

«Так былі пастаўлены кульгавы з сьляпым сьцерагчы таго, што ўнутры, як патрыярхі, архіепіскапы і ігумены ёсьць пастаўлены між царквою і аўтаром сьцерагчы сьвятых тайнаў ад ворагаў Хрыстовых, гэта значыць ад гэрэтыкаў, злосных спакуснікаў, нячэсных грэхалюбцаў і дрэнных іншаверцаў».

Пытаньнем ерархіі ў Царкве Кірыл займаецца таксама ў сваім казаньні на Вербную Нядзелю. Вось што ён там кажа:

«Словы Евангельля, якія шматразова Хрыстос казаў дзеля збаўленьня людзей, ёсьць стравaю для нашых душаў. Ягоны-ж слаўны і чэсны дом — царква — мае выдатных будаўнікоў: патрыярхаў, япіскапаў, сьвятароў і ігуменаў і ўсіх царкоўных настаўнікаў, якія, стаўшыся верaю і чысьцінёю жыцьця блізкімі Богу, атрымалі праз ласку Сьвятога Духа розныя дары навучаньня і аздараўленьня паводле меры дару Хрыстовага».

Такім чынам, паводле Кірыла, царкоўныя ерархі зьяўляюцца будаўнікамі Дому Божага, настаўнікамі і сторажамі сьвятых тайнаў. Яны не самазванцы, але пастаўлены на гэтае становішча Богам і дзеля выконваньня сваіх абавязкаў кожны з іх атрымоўвае асобы дар Духа Сьвятога. Гэты дар даецца не адразу, але паступова, цераз меньшыя сьвячаньні, каб даць магчымасьць кандыдату падрыхтавацца адпаведна да паўнаты сьвятарства, якое мае япіскап:

«... Хрыстос, дзьмухнуўшы ў твар апосталам,

сказаў: ,Прыміце Духа Сьвятога';[58] гэта быў ня поўны дар, але залог сьвятарства, бо Ён загадаў ім чакаць Сьвятога Духа, які, прыйшоўшы, да канца асьвяціць вас'.[59] Таксама япіскапы сьвяцяць паддзякаў, чытачоў, дыяканаў. Усё гэта ня поўны дар, але толькі залог далейшых сьвячаньняў, каб маглі падрыхтавацца да дасканалага сьвятарства».

Сьвятарства такім чынам ёсьць нечым вялікім. Дзеля таго няма нічога горшага за недастойнае ўспрыйняцьце царкоўнай годнасьці:

«Нічога ня ёсьць так нялюбым Богу, як жаданьне ўзвышацца ў царкоўных годнасьцях; і нічога Яму так не агідна, як самаўпэўненая і велічавая гордасьць тых, якія ўспрыймаюць сьвятарства не паводле Бога».

Кірыл прыраўноўвае недастойнага кандыдата ў япіскапы да Адама, які «уладаючы ўсімі зямнымі багацьцямі, усімі жывёламі, морам і ўсімі стварэньнямі, якія там жывуць, маючы ўсяго паддастаткам у зямным раю, пакваліўся без пасьвячаньня на сьвятыя рэчы, зажадаўшы ўвайсьці з зямнога раю ў нябесны... Ён зрабіў так, як недастойны сьвятарства царкоўнік, які, затаіўшы свой грэх і ня дбаючы аб законе Божым, а толькі дзеля дачэснай славы ўзыйшоў на япіскапскі пасад».

Падобнымі да недастойных кандыдатаў зьяўляюцца тыя царкоўныя дастойнікі, якія жывуць

---

[58] Гл. Ян, 20, 22.

[59] Магчыма Кірыл мае на увеце Ян 16, 13, або Ап. Дэ. 1, 8.

без страху Божага. Да іх сьвяты Кірыл зьвяртаецца з перасьцярогаю:

«Зразумейце сяньня, неразумныя сярод людзей дастойнікі, разбэшчаныя сьвятары! Ці-ж Той, хто даў нам вушы, ня чуе і хто стварыў вочы, ня бачыць?.. Ці-ж Той, хто навучае народы, не зразумее нашага грэшнага ўпадку? Госпад ведае дрэнныя думкі злых людзей: Ён скідае неправедных уладароў і адганяе ад аўтара нягодных сьвятароў. Ніякая годнасьць гэтага сьвету ня выбавіць ад мукі тых, якія ломяць Божыя прыказаньні».

Падобная перасьцярога знайходзіцца таксама ў казаньні на Нядзелю расслабленага:

«Гора таму, хто грэшыць пасьля прыняцьця духоўнага стану — гэта значыць манашаства і сьвятарства, — а нават самому япіскапу, які не баіцца Бога».

Каб не асталося ніякага сумніву, Кірыл сьцьвярджае катэгарычна:

«У якім-бы мы стане ня былі, мы знайходзімся далёка ад Бога, калі ў нас няма добрых учынкаў і жалю за грахі».

У словах «жаль за грахі» адчуваецца ўжо кота надзеі. Як добры пастыр і лекар душаў, Кірыл не агранічваецца дыягнозай хваробы, але адразу прапануе лякарства. Ён перасьцерагае сваіх упаўшых братоў, каб нясьледавалі за прыкладам Юды, які, прадаўшы Хрыста, папоўніў другі страшны грэх:

«Дзеля гэтага не ўпадаем у роспач, як Юда зьняверыйшыся ў Божае міласэрдзе і не ўсумнімся

ў цялесным зьмёртвыхустаньні, як садукеі, але з пакутаю стукаем у Божыя дзьверы, пакуль Ён нам не адчыніць райскіх варотаў».

Няма ніякага сумніву, што Госпад пачуе гэты стук, бо

«Няма такога граху, які-б мог адолець Божае м і л а с эр д з е ».[60]

Сьвятасьць ня ведае нацыянальных межаў. З другога боку сьвятыя, будучы людзьмі, належаць да таго ці іншага народу. Кожны народ зусім слушна ганарыцца сваімі сьвятымі, уважаючы іх за сваіх найлепшых сыноў, якіх сам Бог захацеў уславіць. Такім без сумніву для беларускага народу зьяўляецца сьвяты Кірыл Тураўскі.

---

[60] Неабходна сказаць некалькі слоў аб мове сьв. Кірыла. У 11—12 стаг. пісьменнай мовай на Беларусі была мова царкоўных кнігаў, г. зн. стара- або царкоўнаславянская. Розьніца між гэтай мовай і жывой беларускай існавала ўжо тады, хоць яна ня была яшчэ такая вялікая, як цяпер. Беларускія пісьменьнікі, пішучы, час ад часу ўстаўлялі ў тэкст мясцовыя выражэньні, або пісалі словы згодна з мясцовай вымовай. Гэты працэс адбываўся хутчэй у сьвецкіх пісьменьнікаў, павальней у царкоўных. З часам беларускі элемэнт узмацняўся і адціскаў царкоўна-славянскі на другі плян. Такім чынам у пэўным сэнсе і з вялікімі засьцярогамі мову беларускіх пісьменьнікаў 11-га і 12-га стаг. можна назваць беларускай літаратурнай мовай у ейных пачатках. Такой была мова твораў сьвятога Кірыла. У аснаўным гэта царкоўна-славянская мова, у якой аднак спатыкаецца нямала мясцовых элемэнтаў. Вось некалькі прыкладаў:

Деля; чимь (чымь); падьяки (г. зн. іпадыяканы); пастух; Великы день; Да воскреснет Бог и да разидутся враги его; минувши суботе; книжници... пытають родителю; Сьниде бо на землю, никому не чювшю.

Такіх прыкладаў можна прывесьці далёка больш. Такім чынам нават з моўнага пункту гледжаньня Кірыл можа лічыцца беларускім пісьменьнікам. Гэта асабліва відавочна, калі напрыклад прыпомніць, што «польскі» пісьменьнік Ян Длугош яшчэ ў 15-тым стаг. пісаў па лаціне.

Свае выдатныя здольнасьці і немалыя веды Кірыл аддаў на службу Богу. Будучы склонным да адзіноты, яму прышлося правесьці амаль ўсё жыцьцё ў актыўнай душпастырскай дзейнасьці для дабра іншых. У душы аднак Кірыл астаўся самотнікам. Аставіўшы па сабе багатую літаратурную і духовую спадчыну, ён умеў так добра схаваць сваю асобу, што сяньня толькі з цяжкасьцю можна ўстанавіць галоўныя рысы ягонага жыцьця. Ён быццам усім сваім жыцьцём, ня меньш чым сваімі творамі, хацеў сказаць: «Ня нам, Госпадзе, ня нам, але імені Твайму дай славу» (Пс. 113, 9).[61]

---

[61] Вось ліста галоўных выданьняў твораў сьвятога Кірыла ад пачатку 19-га стагодзьдзя:

1. К.Калайдович, Памятники российской словесности XII века. Москва 1821.

У кнізе памешчаныя ўсе казаньні і аспэтычныя творы сьвятога Кірыла, разам з некаторымі сумніўнымі.

2. М.М. Сухомлинов, Рукописи графа Уварова, т. II, СПБ, 1858. Творы сьв. Кірыла, якія знайходзіліся ў зборах Уварава. Вельмі добры ўступ.

3. А.М. Пономарев, Святой Кирилл Епископ Туровский и его поучення. Памятники древнерусской церковно-учительной литературы. Вып. I. СПб. 1894, бб. 87-198. Казаньні сьв. Кірыла. Вельмі добры ўступ і паясьненьні.

4. Творения святога отца нашего Кирила, епископа Туровского. Издание Евгения, епископа Минского и Туровского. Кіеў 1888. Казаньні ў расейскім перакладзе. Малітвы і канон у арыгінале і расейскім перакладзе.

5. Молитвы на всю седмицу св. Кирилла епископа Туровского. Православный Собеседник, Казань 1857, бб. 235-260, 273—351.

6. Н.К. Никольский, Материалы для истории древнерусской духовной писменности. Сборник ОРЯС АН, т. 82, кн. 8, СПб. 1907. Канон у гонар сьв. Ольгі, а таксама рад сумніўных твораў.

7. М.П. Еремин, Литературное Наследие Кирилла Туровского. Труды Отдела Древнерусской Литературы АН СССР. Масква-Ленінград, т. 11, 1955, бб. 342-367; т. 12, 1956, бб. 340-361; т. 13, 1957, бб. 409-436; т. 15, 1958, бб. 331-348.

Найлепшае і найбольш крытычнае выданьне казаньняў сьв. Кірыла, папярэджанае бібліяграфічным аглядам. Гл. таксама выдатны артыкул гэтага самага аўтара: Ораторское искусство Кирилла Туровского, ТОДРЛ, т. 18, 1962, бб. 50-58.

## Дадатак

# МАЛІТВЫ СЬВ. КІРЫЛА ТУРАЎСКАГА
**у тлумачэньні на сучасную беларускую мову**
**а. Язэпа Гэрмановіча**

## МАЛІТВА ДА БОЖАЕ МАЦІ

*Цара Сьвятога, о, добрая Маці,*
*Глянь літасьціва на грэшнага сына:*
*Руку падай мне — ня дай прападаці, —*
*Вызваль ад грэху, надзея адзіна!*

*Увесь я грэшны душою і целам, —*
*Вачэй падняці да Цябе ня сьмею:*
*Малюся з плачам, каб Ты захацела*
*Мне даць ратунак, як маю надзею.*

*Хрыста радзіла: Ён мёртвых ажывіць. —*
*Ратуй мяне Ты — ў грахох паміраю:*
*Твая малітва мяне ашчасьлівіць, —*
*З Хрыстом паўстану і Бога пазнаю.*

*Ад стрэл варожых духа вельмі злога*
*Твой шчыт надзеі мяне абароніць:*
*Нягодных д'яблаў, (а іх надта многа!),*
*Твой меч магутны у пекла прагоніць.*

*Загразя ў злосьці, глыбей западаю;*
*Каб я ня згінуў ганебна ў астатку,*
*Вырві з балота, падыймі з упадку,*
*Сын блудны — ласкі тваей выпрашаю!*

*Загады Сына твайго я пакінуў, —*
*Я адвяртаўся ад Яго навукі:*
*О, Найсьвяцейша, каб-жа я ня згінуў,*
*Ратуй ад пекла — ад вечнае мукі!*

*А цемра грэху мяне агарнула,*
*О, асьвяці нас сваею зарою! —*
*Сьляпая немач да зямлі прыгнула —*
*Пайду да Бога я разам з Табою.*

*Найпрыгажэйша, цудоўна лілея,*
*Ты між жанчынаў — з усіх кветак Дзева,*
*Божая Маці, магутна надзея,*
*Брама да неба, Ты — райскае дрэва!*

*Грахі як воды мяне абступілі:*
*Думкі нягодны і словы бясстыдны*
*Так з галавою мяне затапілі —*
*Стаўся, як дрэва гнілое, агідны.*

*Цябе вітаю і надзею маю,*
*Чыстая Дзева, маё ачышчэньне,*
*О, Маці Божа, у бядзе канаю:*
*Сваею ласкай прысьпяшы збаўленьне!*

*Мяне разьдзерці і пажорці хоча*
*Люты зьвер-вораг, (яму душаў мала!),*
*Каб цябе бачыць, адчыні мне вочы,*
*Язык ачысьці — пяяць Тваю хвалу!*

*«Вітай, Марыя!» клічу з арханёлам*
*Усей душою — пяю цэлай сілай:*
*Прад Божым Тронам, прад нябескім хорам —*
*«Радуйся шчасьцем у Айчыне мілай!»*

*Богу у Тройцы, — вечна хвала ў небе:*
*О, Маці Божа, ведаеш дарогу —*
*Саму бліжэйшу — у маей патрэбе —*
*Мае малітвы пакажы ўсе Богу!*

*Аман.*

## МАЛІТВА ДА СЬВ. ТРОЙЦЫ

*Дай, добры Божа, зару й сонца бачыць,*
*Тваею ласкай захавай ад грэху:*
*К Табе ўздыхае маё сэрца, плачыць —*
*Дай ў Тваей сіле мне знайсьці пацеху!*

*Ты сьвет уладзіў на людзкую службу —*
*Такі карысны і такі прыгожы,*
*Каб мы, ўвайшоўшы з гэтым сьветам ў дружбу,*
*Цябе хвалілі, найлепшы наш Божа!*

*Табе малюся, Божа міласьцівы,*
*Дай мне убачыць сьвет твой найясьнейшы —*
*Цябе Самога і ўсе ў небе дзівы —*
*На векі вечны, Божа наймілейшы!*

*Тваею моцай і я моцны стану —*
*Айца і Сына і Духа Сьвятога —*
*Тройцу адзіну, калі ў неба гляну,*
*Хваліці буду Стварыцеля, Бога.*

*Будзь слава Богу — ў Тройцы ўсемагутнай*
*І жыватворчай, вечнай на заўсёды,*
*І неразьдзельнай і адзінасутнай —*
*У Божай моцы — знак любові-згоды.*
*Аман.*

# МАЛЕБНЫ КАНОН

## *ПЕСЬНЯ 1-ая*

*Бяжы зь Егіпту і ўспомні Майсея,*
*Кінь Фараона — у Хрысьце надзея:*
*Крыж як падыймеш, гляне Бог ласкава —*
*Бог — наша слава!*

*Сьвет няхай знае, што я вінаваты, —*
*Бога абразіў — грахамі заняты:*
*Сам асуджуся і сам расьпішуся —*
*Бога баюся.*

*Дакуль ты блудзіш, душа мая грэшна?*
*Бяжы ад грэху да Хрыста пасьпешна, —*
*Варожы путы разарві — адблутай*
*Сьвятой пакутай!*

*Сьвятую Тройцу сэрафімы славяць,*
*Тварца сусьвету ўсе анёлы хваляць:*
*Божа! пры сьмерці дай мне адпушчэньне —*
*Вечна спасеньне.*

*Як тыя дзевы, што ня мелі масла, —*
*Мая таксала лямпа ўжо загасла... —*
*Ах, Маці Божа, адчыні, як трэба,*
*Браму да неба!*

## ***ПЕСЬНЯ II-ая***

*Закон Мойсея жыды праступілі:*
*«Бога, ён кажа, вы так прагнявілі!..» —*
*Бог справядлівы — усіх нас рассудзе,*
*Што з намі будзе?*

*Адам у раі зламаў Закон Божы*
*І я — з грахамі — стаў Богу нягожы:*
*Сьвятло пакінуў, у цьму апусьціўся —*
*З дарогі зьбіўся.*

*Як Ламех, я да грахоў прызнаўся,*
*Пасьля аднак-жа зноў да іх вяртаўся:*
*Гора мне гора! Моцна ў грудзі б'юся —*
*Бога баюся.*

*Ты — Бог любові,мігласэрдзя, Божа,*
*Хай твая ласка мяне успаможа —*
*Айца і Сына і Духа Сьвятога —*
*Госпада Бога!*

*Я — грэшнік глянуць у неба ня сьмею,*
*Аднак-жа маю у Богу надзею. —*
*Да Маці Божай падыймаю рукі —*
*Збаў нас ад мукі!»*

## *ПЕСЬНЯ III-ая*

*Божа магутны, малюся нясьмела —*
*І дух мой — грэшны і слабое цела:*
*Прыймі малітву і ратуй ад злосьці —*
*Душу і косьці!*

*Грахі успомню — аж сэрца трухлее!*
*Толькі ў Богу адзіна надзея:*
*Хоць у пакусах награшыў я многа, —*
*Міласьць — у Бога.*

*Душа няшчасна, што цябе чакае?*
*Вязьніца ў пекле і доля ліхая!*
*Як не паўстанеш, чакае няволя —*
*Вечна нядоля.*

*Чалавек — грэшны, а Ты — Сьвяты, Божа*
*І твая ласка дараваць мне можа —*
*Айца і Сына і Духа Сьвятога —*
*Добрага Бога.*

*О, Маці Божа! слаўная ад веку —*
*Ты — абарона ў бедах чалавеку:*
*Тваей малітвай Бог дасць разграшэньне*
*І адпушчэньне.*

## ***ПЕСЬНЯ IV-ая***

*Аввакум бачыў Хрыста ў правідзе:*
*Каб нас ачысьціць, з сваей ласкай прыйдзе. —*
*Ратуй нас, Божа, у сьмяротным бою*
*Моцнай стралою!*

*Я ад маленства да грахоў схіляўся:*
*Пякельнай сіле часта паддаваўся —*
*Такі нячысты, такі я бястыдны —*
*Грэшнік агідны!*

*Плакаў за грэх я, зноў у грэх вяртаўся —*
*Цмоку й дракону ўсьцяж аддаваўся... —*
*Душа, пакутуй! Што цябе чакае? —*
*Бог пакарае!*

*Слуга лянівы закапаў манэту —*
*Душа- пустая, — ня прыдбаў працэнту:*
*Сьвятая Тройца, не карай так срога*
*Слугу благога!*

*Грахі бяз ліку — даруй, Божа мілы!*
*Хоць іх аплакаць я не маю сілы:*
*Хрыстова Маці, за мяне маліся*
*І заступіся!*

## *ПЕСЬНЯ V-ая*

*Ісай маліўся прад зарой ранютка,*
*Каб Бог даў кару бязбожнікам хутка:*
*Душа, збудзіся, выйдзі з цемры лютай*
*Шчырай пакутай!*

*Як той Іуда, што для грошаў згінуў,*
*І гэтак Бога для грахоў пакінуў:*
*Прыймі, мой Божа, маю, як Пятрову,*
*Пакуту нову!*

*Ты не надзейся у гэту мінуту —*
*Без сьлёз гарачых — на сваю пакуту,*
*А Бог карае за грэх векавечна —*
*Ня будзь бязпечным!*

*Ўдава ўбога ад злачынцы плача,*
*Я сам — злачынца! вось што прыклад знача:*
*Душа няшчасна, што з табою будзе*
*На Страшным Судзе?*

*О, заступіся — Ты — найлепша Маці,*
*З грахоў, з упадку, калі трэба ўстаці:*
*Душа убога ўдава — вельмі хвора, —*
*Дай помач скора!*

## *ПЕСЬНЯ VI-ая*

*Малю як Йона і плачу сардэчна,*
*Каб мне ня згінуць за грэх векавечна:*
*— Прымі у Цэркву, прашу з усей сілы,*
*Ах, Божа мілы!*

*Хрысьце, мой Спасе! грэшнік я убогі*
*Твае сьвятыя цалую парогі —*
*З жалем-пакорай, хоць быўшы няверны, —*
*Будзь міласэрны!*

*Ратуй ад згубы, дай любоў у сэрцы,*
*Знайдзі як драхму, што у паняверцы*
*Была ў балоце: буду я вясёлы,*
*Так як анёлы.*

*Няма ратунку нігдзе, ад нікога —*
*Толькі у небе і толькі ад Бога —*
*Сьвятая Тройца мяне успаможа —*
*Мой Моцны Божа!*

*О, Маці-Божа, прашу — заступіся —*
*Ты наймацнейша ад усіх — маліся:*
*Выпрасі ласкі для мяне слабога —*
*На Судзе ў Бога!*

## *ПЕСЬНЯ VII-ая*

*Бог даў анёла: з печы агнявое*
*Сьвятых звальняе. Варагоў затое,*
*Агнём спаліўшы, забраў на Суд ўласны,*
*А Суд быў страшны!*

*Душа, пакутуй, бо так мала часу!*
*Каб там ня выйшла, так як Анастасу —*
*Цару, што трапіў на Суд Божы люты —*
*І без пакуты ...*

*Хвядос Вялікі пад царквой маліўся —*
*Ён у пакуце там з грахоў абмыўся:*
*І ты ў пакуце да Бога вярніся —*
*Плач і маліся!*

*Паклон дам Богу — Айцу, такжа Сыну,*
*Сьвятому Духу: Тройцу так адзіну*
*Буду хваліці — ўзносіць рукі й вочы*
*І днём і ўночы.*

*О, Маці Божа! Ты — радасьць адзіна,*
*Прасі Ісуса Хрыста — Свайго Сына:*
*Хай міласэрны грэшным дзецям будзе —*
*На сваім, Судзе!*

## *ПЕСЬНЯ VIII-ая*

*Сьвятых малітва агонь астудзіла,*
*Бо у малітве ёсьць вяліка сіла:*
*Юнакі ў печы Бога выхвалялі —*
*Гімны пяялі.*

*Дрэнна малітва — бяз добрага дзела!*
*Апостал Павал кажа мудра й сьмела:*
*«Пяць словаў скажаш — больша слава ў Бога,*
*Як ляпаць мнюга!»*

*Ах, мілы Божа! малітву худую,*
*Што ў цяжкім горы Табе ахвярую,*
*Лічы за грэх мой, хоць проста малюся*
*І ў грудзі б'юся!*

*З глыбгні сэрца клічу я ў патрэбе:*
*«Даруй грахі мне, Божа Ойча ў небе,*
*Ня ўводзь ў пакусу і збаў ад благога —*
*Ад духа злога!*

*«Вітай, Марыя! — прашу — заступіся,*
*Ня гардзь малітвы — за мяне маліся:*
*Сваей рукою — ад кожнай напасьці —*
*Ратуй ў няшчасьці!*

## *ПЕСЬНЯ IX-ая*

*Дзева Марыя, Ты — Божая Маці,*
*Адама-Еву магла ратаваці:*
*Мяне таксама выбаві ад блуду —*
*Дзякаваць буду!*

*Мноства анёлаў — Вы ў Бога шчасьлівы:*
*Маліце — будзе і мне літасьцівы. —*
*Ў малітве вашай я маю надзею —*
*Прасіць ня ўмею ...*

*О, Хрысьце-Божа! стаю я зграшыўшы,*
*Людзей ты збавіў, кроў сваю праліўшы:*
*Збаў мяне, Збаўца, заслугамі тымі —*
*Разам з Сьвятымі!*

*Я, як асуджан, перад самым сконам,*
*Дрыжу у страху перад Божым Тронам:*
*Грэшнік вялікі — ласкі спадзяюся —*
*Богу малюся.*

*Выбаў, о, Маці! ад агню, ад мукі:*
*Прашу я ласкі, апекі, парукі:*
*Зрабіць мне можаш просьбамі сваімі Разам з*
*Сьвятымі.*

## ЗЬМЕСТ

1. Кірыл і яго век ............................................ 4
2. Духоўны настаўнік…………………….......... 21
3. Пявец Божага Міласэрдзя…………………...... 36
4. Залатавусны ................................................ 52
5. Добры пастыр ............................................. 73
6. Дадатак: Малітвы сьв. Кірыла………….... 81

Druck: “Logos” G.m. b. H., 8 Munchen 19, Bothmerstr. 14